

АРГУМЕНТАЦЫЯ ЗА ВАКЦЫНАЦЫЮ 4

ЧАМУ РАЗГАРНУЎСЯ ГЛАБАЛЬНЫ ДЭФІЦЫТ? 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СУБОТА № 205 (29574)

## КОРАТКА

• Рома Кагадоўскі за выратаванне свайго малодшага брата пры пажары ўзнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць». Узнагарод таксама ўдастоены ўрачы Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска, якія былі задзейнічаны ў лячэнні Рамана ад апёкаў, атрыманых пры выратаванні брата.

• **У Беларусі можа з'явіцца новы горад — Бараўляны. Адпаведнае рашэнне можа быць прынята кіраўніком дзяржавы ў першай палове 2022 года.**

• Больш за 2 млн беларусаў прайшлі поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Сёння прамысловыя прадпрыемствы будаўнічай галіны паказваюць ндрэнныя вынікі работы, пра гэта ў першую чаргу сведчаць узровень рэнтабельнасці, аб'ёмы вытворчасці, тэмп росту экспарту і іншыя паказчыкі. Аднак для таго, каб і ў далейшым заставацца канкурэнтаздольнымі на ўнутраным і замежных рынках, мець стабільную эканоміку ўнутры прадпрыемства і ў цэлым спрыяць развіццю эканомікі краіны, неабходна перыядычна праводзіць работу па мадэрнізацыі вытворчасці, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, змяншэнні сабекошту прадукцыі і, самае галоўнае, забеспячэнні дастойных умоў працы і ўзроўню заработнай платы працоўнага калектыву, стварэнні ўмоў для пастаяннага ўдасканалення і росту прафесійных навыкаў работнікаў».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «СЁННЯ ЯК НІКОЛІ НА ЎЛІКУ КОЖНАЯ КАПЕЙКА»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з кіраўніцтвам Саўміна абмеркаваў надзённыя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пытанні**

**На парадку дня нарады было некалькі тэм: бяспека персанальных даных у лічбавай прасторы, развіццё электратранспарту, заканатворчасць, рэалізацыя інвестыцыйных праектаў, барацьба з ковідам, рост цэн і ўборка ўраджаю. Кіраўнік краіны адзначыў: нягледзячы на тое, што праблемы разнапланавыя, іх аб'ядноўвае адно — актуальнасць рашэння для нашага грамадства.**



Фота БелТА.

### ПРА ІНФАРМАЦЫЙНУЮ БЯСПЕКУ

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў маі бягучага года прыняты закон, накіраваны на забеспячэнне і ахову правоў грамадзян пры апрацоўцы іх персанальных даных. Для яго практычнай рэалізацыі і належнага кантролю ў названай сферы неабходна стварыць асобную структуру.

Прэзідэнт падкрэсліў, што хацеў бы пачуць вынікі ўсебаковай прапрацоўкі гэтага пытання. «Якія варыянты вывучаліся і што прапануецца зрабіць у гэтым кірунку з улікам міжнароднай практыкі і нашых магчымасцяў? Чаму не разглядаецца магчымасць ускладання функцый па ахове персанальных даных на адзін з існуючых у нашай краіне органаў?» — заўважыў кіраўнік краіны. СТАР. 2

Надзённае

# НАРЫХТОЎЧЫ КРЭАТЫЎ

Сакрэты вясковых клопатаў увосень



Пра бяспеку састарэлых у Лельчыцкім раёне клапоцяцца супрацоўнікі МНС.

**Перад многімі ўладальнікамі прыватных дамоў з пячным ацяпленнем цяпер востра паўстала пытанне, як нарыхтаваць паліва для ацяпляльнага сезона, ды не наламаць дроў. Асабліва цяжка справіцца з такой задачай пажылым людзям, самотным пенсіянерам, інвалідам. Многім неабходная дапамога і ў нарыхтоўцы садавіны і гародніны на зіму. Жыхары глыбінкі Прыпяцкага Палесся падзяліліся, як запасаюцца на зіму, рыхтуюцца да халадоў і як спагада да чужога клопату можа таксама саграваць.**

### ДРОВЫ-«ДЭЛІКАТЭСЫ»

Настаўніца вясковай школы з больш як саракагадовым стажам, а цяпер старэйшына вёскі Сініцкае Поле Лельчыцкага раёна, **старшыня ветэранскай арганізацыі Валянціна Паўлаўна ШУКАЛОВІЧ** на пячным ацяпленні, як той казаў, зубы з'ела. Увесь свой век не змяняе надзейнай печы — сэрцу вясковага дома. Жыццё, кажа, навучыла і пілаваць, і калоць дровы. Ведае яна і навошта загадзя клапаціцца аб паліве: як вясковец падыходзіць да загатоўкі дроў — такая яго гаспадарская самавітасць. Сама Валянціна Паўлаўна можа словам і справай дапамагчы іншым пенсіянерам са сваёй вёскі, што дбаюць пра цёплы дом зімой. СТАР. 7

Прыкметы часу

# АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ

**Пераканаліся, што медыцынскія маскі сталі часткай паўсядзённага жыцця і без прымусу**

**Пахаладала, і ковід зноў стаў навіной нумар адзін у сродках масавай інфармацыі, на навінавых парталах і адной з абавязковых тэм у любой размове. З раніцы сучасны гараджанін звыкла ўдакладняе ў інтэрнэце інфармацыю аб узроўні захворвання ў сваёй краіне і новых штамах каранавіруса адразу пасля таго, як даведваецца аб надвор'і на сёння. Наяўнасць маскі, выходзячы з дома, мы цяпер правяраем разам з тым, ці не забыліся на ключы і мабільны тэлефон. Як гэта ўплывае на наша светаўспрыманне?**

Эпідэміёлагі не стамляюцца паўтараць аб важнасці выкарыстання індывідуальных сродкаў аховы ў месцах масавага збору людзей. Але калі часова абстрагавацца ад эпідэміялагічнага аспекту і зірнуць на маскі як на частку нашай штодзённасці, медыкі і псіхолагі кажуць як пра плюсы, так і пра мінусы неабходнасці хаваць палову твару. Галоўным плюсам рэгулярнага нашэння масак лор-урачы называюць фарміраванне звычкі дыхаць носам. Ротавае дыханне правакуе рост захворванняў на пнеўманіі (у тым ліку не звязанымі з ковідам): пры дыханні праз рот у лёгкія трапляюць пыл, вялікая колькасць вірусаў і бактэрый, насавое ж дыханне фільтруе паветра, і яно ўваходзіць у лёгкія больш чыстым. СТАР. 5



Аб неабходнасці насіць маску плакаты нагадваюць літаральна на кожным кроку.

# «СЁННЯ ЯК НІКОЛІ НА ЎЛІКУ КОЖНАЯ КАПЕЙКА»

### УКАРАНЕННЕ ЭЛЕКТРАТРАНСПАРТУ

Другое пытанне нарады датычылася перспектыўных напрамкаў выкарыстання электратранспарту. Па словах кіраўніка краіны, сусветная практыка паказвае, што курс на развіццё, апераджальнае ўкараненне інфраструктуры быў правільны і практычна ўсе краіны ідуць гэтым шляхам.

«Гэта надзённая неабходнасць і для нас — як з пазіцыі адсутнасці дастатковых аб'ёмаў уласнай нафты, так і з улікам запуску Беларускай АЭС. Акрамя эканамічных аспектаў, немалаважнае і экалагічнае вымярэнне гэтай праблемы. Таму спыніцца ў стварэнні належных умоў функцыянавання гэтай новай сферы нельга ні ў якім выпадку», — сказаў Прэзідэнт, нагадаўшы пра рашэнне гадавой даўніны аб вылучэнні шэрагу льгот для павышэння зацікаўленасці насельніцтва ў набыцці легкавых электрамабіляў. Як лічыць урад, гэтая практыка сябе апраўдала, а цяпер наспела неабходнасць увядзення дадатковых стымулаў.

Аляксандр Лукашэнка запытаўся, ці дазволяць гэтыя стымулы больш актыўна абсталёўваць паркі электратранспарту як для пасажырскіх, так і для камерцыйных перавозак, ці зробяць яны гэтую тэхніку больш даступнай для нашых грамадзян і бізнесу?

«Акрамя таго, нельга забываць і пра інфраструктуру. На запраўачных станцыях па ўсёй краіне павінна быць магчымасць хуткай зарадкі легкавых электрамабіляў. На сёння толькі каля 10 працэнтаў аўтазапраўачных станцый аказваюць такую паслугу. А трэба значна больш. Мы нядаўна размаўлялі з чалавекам, які за гэта адказвае, — кіраўніком «Беларусьнафты» Ляхавым (Аляксандрам. — **«Зв.»**). Усе задачы вырашаны. Нічога не стрымлівае, каб нарошчваць магутнасці. Тым больш што неабходнае абсталяванне для гэтага Беларусь стварае поўнасцю», — падкрэсліў кіраўнік краіны, дадаўшы, што хацеў бы атрымаць больш выразныя ацэнкі чаканых наступстваў прапанаваных у гэтым кірунку рашэнняў.

### НАВАЦЫІ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ

На нараду таксама вынесена пытанне аб актуалізацыі асобных актаў кіраўніка дзяржавы з улікам новых кодэксаў аб адміністрацыйнай адказнасці, а таксама закона па пытаннях сацыяльных нарматываў і мінімальнай заработнай платы.

«Мяркуецца замяніць такі індыкатар, як велічыня мінімальнага спажывецкага бюджэту, на велічыню бюджэту пражытковага мінімуму. Ці не атрымаецца, што з-за тэхнічных правак перастануць працаваць даўно адладжаныя механізмы? Гэтага дапусціць нельга, бо атрымаецца так, як некалі ў сістэме адукацыі: хацелі як лепш, а атрымалася як вядома», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што выклікае занепакоенасць інфармацыя аб праблемах у рэалізацыі шэрагу інвестыцыйных праектаў. «Мы не можам сарваць устаноўленыя тэрміны, таму што гэта значныя фінансава-эканамічныя страты. А сёння як ніколі на ўліку кожная капейка», — заўважыў Прэзідэнт. Разам з тым ён лічыць, што шэраг пытанняў маглі быць вырашаны і без удзелу кіраўніка дзяржавы: «Пры тым, што ў нас ёсць больш надзённыя і нават неадкладныя праблемы. Гаворка перш за ўсё ідзе аб барацьбе з пандэміяй».

### ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА І РОСТ ЦЭН

Па словах кіраўніка краіны, акрамя супрацьэпідэмічных пытанняў стаіць задача стрымлівання росту цэн, каб яны не перавышалі прымальны для насельніцтва ўзровень. Асабліва гэта датычыцца прадуктаў харчавання. «Людзі не хочуць разумець, што рост цэн на нейкія тавары — гэта дабрабыт калектываў, што ствараюць гэтыя тавары, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гараджан не цікавіць, што, калі цэны на бульбу выраслі, гэта значыць, сяляне атрымалі невялікі дадатак да сваёй заработнай платы. Гараджан гэта не цікавіць, людзі так не мысляць»...

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, важная тэма, якую ўзнімаюць людзі, — суадносіны росту цэн і даходаў насельніцтва. «Людзям усё роўна, якія будуць цэны ў магазіне. Былі б грошы ў кішэні, каб за гэтую цану набыць тавар. І вось гэтую прапорцыю і баланс неабходна падтрымліваць, чаго б гэта ні каштавала. Я хачу, каб ва ўрадзе, прафсаюзах і дэпутаты гэта зразумелі», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

З прыняццем антыінфляцыйных мер павінен быць наведзены парадак там, дзе пачынаецца эканоміка галіны, якая забяспечвае харчовую бяспеку, звярнуў увагу кіраўнік краіны. Яго часам насцярожваюць тэндэнцыі ў аграпрамысловым комплексе, хоць дзяржава падставіла пляхо па ўсіх пытаннях, дзе была запытана падтрымка. «Уборку ўраджаю ў цэлым завяршылі. Засталося крыху буракоў, яны збіраюцца па плане. Гэта не праблема. Скончылі практычна ўборку бульбы. Кукурузу на сілас амаль сабралі, засталася кукуруза на зерне. Многія лічаць, што кукурузу на зерне можна збіраць і ў снежні, магчыма, калі будзе сухое надвор'е. Але ў Беларусі такога не бывае, таму рызыкаваць не трэба. Неабходна заканчваць з уборкай кукурузы на зерне. І гэты працэс трэба актывізаваць», — патрабуе Прэзідэнт.

Гэта, заўважае ён, дае дадатковыя тысячы тон зерня, якіх не хапае. Таму магчымасць па выніках года будзе выйсці на вытворчасць усіх відаў збожжавых звыш дзевяці мільёнаў тон. «Канешне, гэта не 10 мільёнаў тон леташнія, але дзевяць мільёнаў — прымальны аб'ём, што забяспечыць цалкам патрэбы нашай дзяржавы. Хопіць і для людзей, і для кармлення жывёлы, каб было мяса і малако. Неабходна актывізавацца».

Тут жа стаіць і пытанне закладкі стабілізацыйных фондаў. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў кіраўнікоў усіх узроўняў: стабфонды з савецкіх часоў выкарыстоўваем як рэзерв для згладжвання скачкоў цэн і стабільнага насычэння спажывецкага рынку ў міжсезонны перыяд. «Капуста, бульба, морква, буракі і іншае, што мы закладаем у сховішчы, — гэта каб забяспечыць нашых людзей у восеньска-зімовы перыяд, пакуль не з'явіцца новы ўраджай. Зрабіце так, каб гэтых прадуктаў хапіла. На працягу лістапада нам патрэбна будзе грунтоўная размова па гэтых пытаннях: гатоўнасць да зімова-стойлавага перыяду і запаўняльнасць агароднінасховішчаў на зіму», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён яшчэ раз адзначыў, што пытанняў, якія патрабуюць рашэння, шмат і іх будуць падкідваць з розных бакоў, асабліва ў інфармацыйнай прасторы. «99,8 працэнта — гэта фэйкі, але ёсць інфармацыя, на якую неабходна звяртаць увагу. Таму праходзіць гэты маніторынг і з выездам на месца. Я не хачу пералічваць усе гэтыя фэйкі. Камітэт дзяржкантролю за ноч і раніцу праверыў некаторыя рэчы. Дзіву даешся, калі гэта чытаеш», — абураецца Прэзідэнт.

### ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ДЫСЦЫПЛІНА І АДНААСОБНАЕ КІРАЎНІЦТВА

Аляксандр Лукашэнка вяртаецца да тэмы ковіду і адзначае, што ўсе яго рашэнні ў гэтай сферы падлягаюць хуткаму выкананню. Па яго словах, у сённяшняй складанай сітуацыі ў свеце і дзяржаве вельмі важная выканальніцкая дысцыпліна і аднаасобнае кіраўніцтва.

«Калі ідзе вайна, не абмяркоўваюцца розныя варыянты на працягу тыдняў, бо за гэты час загінуць тысячы людзей. І лепш прыняць не зусім дакладнае рашэнне, але дзейнічаць, чым бадзягу цягаць з боку на бок. Мною прынятыя выверaныя рашэнні, якія падтрыманы людзьмі, ды і вы не былі супраць. Дык выконвайце! Таму любое невыкананне, інфармацыя на гэту тэму — не скардзіцеся на мяне, нягледзячы на тое, што вы ўсе мае людзі, але працаваць вы са мной не будзеце. Гэта датычыцца ўсіх, асабліва Мінска», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважае, што апаненты ўлады чапляюцца да ўсяго, любых выказванняў і дзеянняў кіраўніка краіны. Па яго словах, на нарадзе па ковіду спецыялісты адзначылі: каранавірус «прыціснуў» сезонны грып, і той пакуль амаль не цыркулюе. Плюс за часы пандэміі адбылося рэзкае падзенне захваральнасці на анкалогію і смяротнасці ад яе. Як паведаміў Аляксандр Лукашэнка, вучоныя першы год думалі, што людзі не звяртаюцца з анкалагічнымі праблемамі з-за страху ковіду, калі зніжэнне працягвалася другі год, спецыялісты зрабілі вывад: ковід паўплываў на цячэнне анкалагічных захворванняў. «У нашым цэнтры анкалогіі вучоныя гэта заўважылі. Я пачаў Краснага (Сяргей, намеснік дырэктара РНПЦ анкалогіі і гематалогіі. — **«Зв».**) дапытваць, і ён сказаў, што гэта заўважаюць, і рызыкнуў у свеце гэта заявіць. Я сказаў, што ў свеце аб яго ногі вытруць добра: навіна — ковід «прыціснуў» анкалогію. Я пра гэта сказаў у іншай бальніцы (Мінскай абласной бальніцы. — **«Зв.»**), што пачарпнуў нешта новае: учора, што ковід «прыціснуў» грып, а сёння, што ковід паўплываў на анкалогію, — расказвае на нарадзе Аляксандр Лукашэнка. — Я тады адзначыў, што лепш мы будзем лячыць ковід, чым анкалогію. Божа мой! Ад Беларусі да Амерыкі — хто толькі ногі не выцірае аб гэту заяву Прэзідэнта. Я ж не сказаў, што ковід лечыць анкалогію. І кожны чапляецца, хай амерыканцы, еўрапейцы, але ў Расіі колькі разумных з'явілася: «Прэзідэнт не спецыяліст, кажа, што ковід лечыць анкалогію». Але ж я так не гаварыў. Гэта сведчыць пра тое, што на любое чханне рэагуюць вакол — Беларусь як костка ў горле».

**Марыя ДАДАЛКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## КАМЕНТАРЫІ Ў ТЭМУ

**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр Беларусі,** пасля нарады акцэнтаваў увагу на стане інвестыцыйнага праекта, пра які ішла размова на нарадзе, — Мёрскі металапракатны завод.

«Урад прапанаваў крокі па стабілізацыі фінансава-эканамічнай сітуацыі на прадпрыемстве, якое аказалася ў цяжкім становішчы па шэрагу прычын. Была вялікая колькасць пралікаў на стадыі інвестыцыйнай. І зараз на прадпрыемстве цяжкасці з абслугоўваннем сваёй крэдытнай нагрузкі, — паведаміў прэм'ер. — Нягледзячы на тое, што гэта праект прыватны (дзяржава ўдзельнічала толькі ў стварэнні інфраструктуры да яго), прынята рашэнне: дзяржава прадпрыемства не кіне».

Асноўная прычына — кадры, якіх на заводзе каля 600 чалавек. Раман Галоўчанка запэўнівае: завод будзе жыць. «Мы будзем адказваць за тое, каб гэта прадпрыемства працавала, захоўвала працоўныя месцы і выйшла на тыя параметры, што дазволяць выконваць свае абавязкі перад крэдыторамі», — рэзюмаваў тэму кіраўнік Саўміна.

**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі**, прадставіў рашэнні па развіцці электратранспарту ў краіне. Ён расказаў, што за тры гады 5700 электрамабіляў былі куплены са зніжкамі, якія ўстанавіў адпаведны ўказ. Па словах міністра, актыўна развіваецца інфраструктура пад электратранспарт: у краіне створана больш за 480 зарадных станцый. Да канца года іх ужо будзе каля 600.

Але колькасць электрамабіляў у беларусаў усё яшчэ нізкая. Іх доля менш чым 1 %. Для стымулявання набыцця электратранспарту на нарадзе былі ўнесены наступныя прапановы. «Нормы ўказа, што ўжо існуюць, будуць распаўсюджаны не толькі на легкавы, але і на грузавы, пасажырскі транспарт. Тым самым будзем стымуляваць купляць не толькі фізічных асоб, але і юрыдычных. Другі момант датычыцца саміх мер стымулявання: гэта нулявы ПДВ для вытворцаў электрамабіляў і тых, хто ўвозіць камплектуючыя», — паведаміў міністр.

**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны**, расказала падрабязнасці актуалізацыі ўказаў кіраўніка дзяржавы з улікам закона па пытаннях сацыяльных нарматываў і мінімальнай заработнай платы. Ім з 15 лістапада адмяняецца мінімальны спажывецкі бюджэт і ўводзіцца ў якасці адзінага сацыяльнага нарматыву бюджэт пражытковага мінімуму. «На практыцы сёння ў большасці выпадкаў па ўсіх пытаннях сацыяльнай палітыкі, абароны і падтрымкі грамадзян дзейнічае перш за ўсё бюджэт пражытковага мінімуму. Гэта ўзровень малазабяспечанасці, пенсійнае забеспячэнне, сацыяльная падтрымка малазабяспечаных грамадзян. Таму, бачачы, што на практыцы больш за ўсё працуе бюджэт пражытковага мінімуму (ён яшчэ ў нас вызначаецца па сацыяльна-дэмаграфічных групах), быў прыняты такі закон, які ўстанаўлівае адзіны сацыяльны нарматыў», — патлумачыла міністр.

«Усё мяняецца суразмерна з тымі велічынямі, якія дзейнічаюць у сённяшнім заканадаўстве. Таму ні да якога сацыяльнага напружання ў пытаннях, якія закранаюць змены дадзеных параметраў, гэта не прывядзе, — звярнула яна. — Два мінімальныя спажывецкія бюджэты (быў такі крытэрый ва ўказе) мяняюцца на тры бюджэты пражытковага мінімуму. Гэта значыць, сама велічыня ў рублёвым выяўленні застаецца такой жа. Мяняецца толькі крытэрый».

**Андрэй ПАЎЛЮЧЭНКА, начальнік Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце,** паведаміў, што кіраўнік краіны падтрымаў ідэю па стварэнні паўнамоцнага дзяржаўнага органа, які будзе адказваць за ахову персанальных даных.

«Гэты дзяржорган будзе створаны, каб развіваць заканадаўства, знаходзіць ініцыятывы, узаемадзейнічаць з аператарамі, што апрацоўваюць вялікую колькасць персанальных даных. Ён будзе выдаваць рэкамендацыі нашым грамадзянам, навучаць людзей больш уважліва стаўленню да інфармацыі, што яны пакідаюць у адкрытых крыніцах. Гэта будзе такога роду адукацыйная работа з суб'ектамі», — сказаў Андрэй Паўлючэнка.

Будучая структура атрымае назву Нацыянальны цэнтр па ахове персанальных даных і атрымае незалежнасць для свабоднага ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі і прыватнымі ўстановамі.

Кантэкст

# Бадалася Варшава з Бруселем

## Польшча заяўляе аб шантажы і пагрозах з боку еўрачыноўнікаў

**Еўрапейскі парламент (ЕП) на пленарнай сесіі ў Страсбургу большасцю галасоў зацвердзіў рэзалюцыю (яе падтрымалі 502 дэпутаты, супраць прагаласавалі 153, устрымаліся 16), у якой заклікаў Еўракамісію і Савет ЕС неадкладна ініцыіраваць судовы разгляд з-за парушэння Польшчай прынцыпаў вяршэнства еўрапейскіх законаў, а таксама адмовіць Варшаве ў выдзяленні сродкаў з фонду ЕС для фінансавання нацыянальнага плана аднаўлення эканомікі пасля пандэміі.**

Гаворка ідзе ў першую чаргу аб рэкордным у гісторыі ЕС фондзе ў памеры 750 мільярдаў еўра. Варшава павінна атрымаць больш чым 58,1 млрд еўра. Гэта надзвычай патрэбныя для краіны ў цяперашняй сітуацыі сродкі. У верасні інфляцыя ў Польшчы склала 5,9 % — найвышэйшы паказчык за апошнія 20 гадоў. Акрамя цэн на прадукты харчавання, у Польшчы, як у цэлым і ва ўсёй Еўропе, значна выраслі цэннікі на паліва.

Раней прэм'ер-міністр Польшчы Матэуш Маравецкі на фоне спрэчак аб вяршэнстве нацыянальных законаў над заканадаўствам Еўрасаюза абвінаваціў ЕС у шантажы. Пра гэта кіраўнік польскага ўрада заявіў, выступаючы перад Еўрапарламентам у Страсбургу. "Я не згодны з тым, што палітыкі хочуць шантажыраваць Польшчу і пагражаць ёй", — заўважыў Маравецкі. Заява польскага прэм'ера прагучала на фоне падрыхтоўкі Еўракамісіяй судовага іску супраць урада Польшчы. Ён датычыцца магчымай неадпаведнасці Канстытуцыі рэспублікі еўрапейскаму заканадаўству. Канстытуцыйны суд (КС) Польшчы 7 кастрычніка прызнаў прымат заканадаўства гэтай краіны над законамі Еўрасаюза. Асобныя палажэнні заканадаўства ЕС несумяшчальныя з Канстытуцыяй Польшчы, пастанавіў суд. На думку суддзяў, членства краіны ў Еўрасаюзе не дае органам ЕС вяршэнства ў судовай сферы і не азначае перадачу Варшавай свайго суверэнітэту.

Гэта рашэнне выклікала жорсткую крытыку з боку кіруючых органаў Еўрасаюза. «Мы не можам дазволіць і мы не дазволім ставіць пад пагрозу нашы агульныя каштоўнасці. Камісія будзе дзейнічаць. І ўсе опцыі вам вядомыя», — заявіла старшыня Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен на пасяджэнні Еўрапарламента. Паводле яе слоў, ЕК можа юрыдычна аспрэчыць рашэнне Канстытуцыйнага суда Польшчы, задзейнічаць умоўны механізм фінансавання і іншыя фінансавыя механізмы або задзейнічаць артыкул 7 дагавора аб Еўрапейскім саюзе, у якім маецца на ўвазе канстатацыя пагрозы парушэння адной з дзяржаў – членаў агульных каштоўнасцяў ЕС. У выпадку падобнай канстатацыі можа быць прынята рашэнне аб прыпыненні пэўных правоў гэтай краіны.

Еўрачыноўнікі справядліва згадваюць Польшчы і нечалавечыя адносіны да мігрантаў. Парушэнні правоў чалавека ўсё часцей адбываюцца ў дачыненні да просьбітаў прытулку на граніцах краін Савета Еўропы (СЕ), лічыць камісар СЕ па правах чалавека Дунья Міятавіч. Адпаведная заява была апублікавана яе прэс-службай, паведаміла ТАСС. «Парушэнні правоў чалавека ў адносінах да бежанцаў, просьбітаў прытулку і мігрантаў на граніцах дзяржаў — членаў Савета Еўропы растуць з пагрозлівай хуткасцю. Дзяржавы — члены СЕ павінны заняць пазіцыю супраць адцяснення бежанцаў на граніцах і выразна супрацьстаяць спробам легалізаваць гэтую незаконную практыку», — заявіла Дунья Міятавіч.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей у сваім акаўнце ў сацыяльнай сетцы Facebook выказаўся ў падтрымку тэзісаў, агучаных прэм'ер-міністрам Польшчы Матэушам Маравецкім падчас слухання ў Еўрапарламенце. Кіраўнік беларускага МЗС, у прыватнасці, правёў паралелі паміж выказваннямі польскага прэм'ера і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, паведаміла БелТА.

«Сябры, прапаную прайсці невялікі тэст. Хачу падзяліцца з вамі некалькімі цытатамі аднаго, упэўнены, вельмі вядомага вам палітыка сучаснасці. Разумею, што рызыкую быць падвергнутым крытыцы, бо як мне рэгулярна і з розных бакоў ставяць у дакор падтрымку падобнага палітычнага курсу. І тым не менш», — так пачаў свой пост у сацсетцы кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Далей ён прыводзіць шэраг цытат, якія БелТА публікуе ў нязменным выглядзе:

«...на жаль, мы да гэтага часу чуем аб падзеле на лепшае і горшае. Занадта часта мы маем справу з Еўропай падвойных стандартаў»;

«правілы гульні павінны быць аднолькавыя для ўсіх... Недапушчальна навязваць свае рашэнні іншым без законнай падставы. Таму тым больш непрымальна выкарыстоўваць для гэтай мэты мову фінансавага шантажу, казаць пра штрафы або выкарыстаць яшчэ больш шырокія словы... Я адкідаю мову пагроз, пагроз і вымагальніцтва... Гэты шантаж становіцца метадам палітыкі ў дачыненні да адной з дзяржаў... Дэмакратыі так не паступаюць»;

«Канстытуцыйны плюралізм азначае, што ёсць прастора для дыялогу паміж намі, нашымі прававымі сістэмамі. Аднак нельга дазваляць аддаваць інструкцыі і загады дзяржавам. Еўрапейскі саюз заключаецца не ў гэтым. Калі мы хочам супрацоўнічаць адзін з адным, мы павінны прызнаць існаванне гэтых адрозненняў, мы павінны прыняць іх, мы павінны паважаць адзін аднаго»;

«Патэрналісцкія ўказанні, якія даходзяць да нас пра дэмакратыю, вяршэнства закона, пра тое, як мы павінны фарміраваць нашу ўласную Радзіму, пра тое, што мы робім няправільны выбар, што мы занадта нясмелыя... з'яўляюцца фатальным напрамкам наратыву, прапанаванага некаторымі. Штрафы, рэпрэсіі эканамічна больш моцных краін супраць тых, хто ўсё яшчэ змагаецца са спадчынай знаходжання на дрэнным баку «жалезнай заслоны», — гэта няправільны шлях».

Уладзімір Макей робіць выснову, што сказанае слова ў слова паўтарае сутнасць шматразовых заяў кіраўніцтва Беларусі і асабіста Прэзідэнта Лукашэнкі, якія абвінавачваецца ў «аўтарытарызме» і нават «дыктатарстве». «Соль, аднак, заключаецца ў тым, што вымаўлена гэта «дэмакратам» Маравецкім, прэм'ер-міністрам Польшчы, падчас нядаўніх слуханняў у Еўрапарламенце. Ёсць, вядома, спрэчныя моманты, але ў цэлым хачу шчыра падтрымаць спадара Маравецкага ў яго праведным гневе супраць цывілізацыйнага шантажу і эканамічнага прымусу. Вельмі дакладныя, а галоўнае своечасовыя, пададыходы дэманструюць польскія калегі», — падкрэсліў кіраўнік МЗС.

«На гэтым фоне няма нават сэнсу разважаць аб «падвойных стандартах» ці ўвогуле аб якіх-небудзь стандартах, бо і так усё ясна. Ці я не маю рацыі?» — адзначыў ён у заключэнне, пакінуўшы месца для магчымай дыскусіі.

Тым часам супрацьстаянне Варшавы і Брусэля працягвае напальвацца. Улады Польшчы не лічаць, што прынятая рэзалюцыя Еўрапарламента, дзе выказана незадаволенасць дзеяннямі Варшавы, якая спрабуе, на думку дэпутатаў, падарваць вяршэнства еўрапейскіх законаў, носіць якісьці абавязвальны характар. Пра гэта заявіў Польскаму радыё намеснік міністра замежных спраў краіны Пётр Ваўжык. Паводле яго слоў, гэтая рэзалюцыя Еўрапейскага парламента «не мае ніякай абавязвальнай сілы ні для кога». «Гэта выключна праяўленне поглядаў еўрадэпутатаў», — адзначыў прадстаўнік МЗС. Як лічыць Ваўжык, ЕП — «орган, які дзейнічае выключна пад дыктат бягучай палітычнай сітуацыі». Па яго словах, замарожванне Бруселем нацыянальнага плана аднаўлення беспадстаўнае і неправамернае. Бяздзейнасць Еўрапейскай камісіі ў гэтым пытанні «будзе падставай для Польшчы падаць скаргу ў Суд ЕС», заўважыў намеснік міністра.

**Пётр ДУНЬКО.**

Актуальна

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Мінск павінен быць прыкладам для ўсёй краіны»

**Заявіла Старшыня Савета Рэспублікі на пасяджэнні Мінскага гарвыканкама па пытаннях добраўпарадкавання сталіцы.**

У Мінгарвыканкаме прайшла нарада па пытаннях добраўпарадкавання сталіцы з удзелам упаўнаважанага прадстаўніка кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталлі Качанавай.

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу прысутных на тым, што Мінск добраўпарадкоўвалі многія пакаленні яго жыхароў, і падкрэсліла: цяпер сучаснікі павінны ўнесці ў гэта свой уклад і зрабіць родны горад яшчэ лепшым і прыгажэйшым, больш камфортным для працы і адпачынку:

— Развіццё і добраўпарадкаванне горада павінна ажыццяўляцца раўнамерна. Сёння неабходна выпрацаваць арганізацыйныя комплексныя падыходы да гэтай работы і замацаваць іх у рашэнні Мінскага гарвыканкама, — цытуе спікера прэс-служба верхняй палаты парламента.

Наталля Качанава адзначыла, што трэба весці гаворку не толькі аб добраўпарадкаванні, але і аб эстэтызацыі гарадскога асяроддзя ў цэлым. Мінск павінен быць прыкладам для ўсёй краіны. І для гэтага ёсць неабходнае: і тэхніка, і спецыялізаваныя прадпрыемствы, і сродкі.

— Кожны кіраўнік павінен наводзіць парадак на сваёй тэрыторыі і разумець: прылеглая тэрыторыя — гэта таксама яго адказнасць. Прыгожыя клумбы, асвятленне, фасады, рэклама, уладкаванне пешаходных дарожак — людзі павінны гэта бачыць, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна перакананая: спыняцца ў дзейнасці нельга. Трэба далучаць студэнцкую моладзь, улічваць яе цікавыя прапановы.

Што датычыцца кантролю, спікер упэўнена: мэтазгодна праводзіць маніторынг штотыдзень і падводзіць яго вынікі штоквартальна. А ў планах па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні павінны быць дакладна вызначаны адказныя выканаўцы — спецыялізаваныя прадпрыемствы, арганізацыі, грамадзяне, а таксама трэба вызначыць перыядычнасць работ. Таму варта ўдзяліць гэтаму пытанню асаблівую ўвагу і падрыхтаваць планы на 2022 год.

— Навядзенне парадку і добраўпарадкаванне — сур'ёзная праца, якую трэба праводзіць сістэмна і з веданнем справы. Тут важныя вельмі жорсткі парадак і дысцыпліна — па-іншаму працаваць сёння нельга. Не чакайце, што нехта гэта будзе рабіць за нас, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

У пасяджэнні Мінгарвыканкама таксама бралі ўдзел памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, інспектар па Мінску Аляксандр Барсукоў і міністр унутраных спраў Іван Кубракоў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ААН заявілі аб пачатку гонкі ўзбраенняў

У свеце пачалася новая гонка ўзбраенняў. Пра гэта заявіў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш, перадае «РІА» Навіны. Яго словы прагучалі на пасяджэнні Савета Бяспекі.

«Мы сутыкаемся з найвялікшай лавінай крызісаў для пакалення — свет коціцца назад з хуткасцю, якая ўсё ўзрастае. Мы зноў бачым ваенныя перавароты, пачалася новая гонка ўзбраенняў», — адзначыў Гутэрыш.

Паводле яго слоў, у цяперашні час ядзерная пагроза знаходзіцца на самым высокім узроўні за апошнія 40 гадоў.

13 кастрычніка, на пленарным пасяджэнні Расійскага энергетычнага тыдня, Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін канстатаваў пачатак гонкі ўзбраенняў паміж Масквой і Вашынгтонам. Яго словы прагучалі пасля таго, як ЗША ў аднабаковым парадку выйшлі з дагавора па супрацьракетнай абароне.

### Больш за дзесяць чалавек загінула пры выбуху парахавога завода пад Разанню

У пасёлку Лясным Шылаўскага раёна Разанскай вобласці ўчора раніцай адбыўся выбух з пажарам на тэрыторыі завода «Эластык», дзе працавала прадпрыемства па вытворчасці пораху і ўтылізацыі боеприпасаў. Паводле розных звестак, загінулі ад 12 да 16 чалавек. Папярэдне, на момант здарэння ў цэху знаходзіліся 17 чалавек.

Прычынай выбуху і пажару назвалі парушэнне тэхналагічнага працэсу.

Спецыялісты Растэхнагляду падчас апошняй праверкі выявілі ў цэху парушэнні, у тым ліку недастатковую арганізацыю захоўвання выбуховых матэрыялаў і рассыпаны порах на падлозе, не прыбраны ва ўстаноўленым парадку.

«З-за парушэння тэхналагічнага працэсу ў цэху па вытворчасці пораху адбыўся выбух з наступным пажарам», — паведамляе ТАСС у экстранных службах.

### Акцёр Алек Болдуін на здымках выпадкова застрэліў аператара з рэквізітнай зброі. Рэжысёр фільма цяжка паранены

Аператар Галіна Хатчынс загінула на здымках вестэрна «Раст» у горадзе Санта-Фэ (штат Нью-Мексіка), у яе выпадкова стрэліў прадзюсар і выканаўца галоўнай ролі ў стужцы — папулярны галівудскі акцёр Алек Болдуін. Ад яго стрэлаў таксама пацярпеў рэжысёр фільма Джоэл Соўса, які знаходзіцца ў крытычным стане.



Прадстаўнік кампаніі, якая вядзе здымкі фільма, паведаміў выданню The Hollywood Reporter, што інцыдэнт адбыўся падчас здымак сцэны, у якой Болдуін страляў халастымі патронамі. Зброя выкарыстоўвалася ў фільме як прадмет рэквізіту.

Хатчынс, якой было 42 гады, адправілі ў бальніцу на верталёце, аднак яна памерла. 48-гадовы Соўса дастаўлены ў бальніцу на машыне хуткай дапамогі.

«Болдуін даў паказанні паліцэйскім, — сказаў афіцыйны прадстаўнік шэрыфа Санта-Фэ агенцтву «Франс Прэс». — Ён прыйшоў добраахвотна і пасля дачы паказанняў пакінуў будынак. Якія-небудзь абвінавачванні па гэтай справе не прад'яўлены, ніхто не арыштаваны».

# «ЭФЕКТ БЯССТРАШША» І ЧАКАЛЬНАЯ ПАЗІЦЫЯ

## Гэта не спрацуе, сцвярджаюць урачы і прыводзяць аргументы за вакцынацыю

**Праз які час праводзіць рэвакцынацыю ад COVID-19 і ці патрэбна яна ўвогуле? Ці можна прышчапляцца адразу пасля таго, як перахварэў? На якім тэрміне можна вакцынавацца цяжарнай жанчыне? Чаму ў Беларусі невысокія тэмпы вакцынацыі? Ці варта чакаць у нас замежныя вакцыны заходніх вытворцаў? Як далей будзе развівацца пандэмія? На гэтыя і іншыя пытанні пра каранавірусную інфекцыю адказалі медыкі і эпідэміёлагі падчас вэбінара «СМІ супраць COVID-19», арганізаванага міністэрствамі аховы здароўя і інфармацыі на базе прэс-цэнтра Дома прэсы. У якасці экспертаў выступілі намеснік галоўнага ўрача па эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ, загадчык лабараторыі грыпу і грыпападобных захворванняў РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ШМЯЛЁВА, загадчык кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый БелМАПА, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Юрый ГОРБІЧ, галоўны ўрач 6-й гарадской клінічнай бальніцы Ігар ЮРКЕВІЧ, галоўны ўрач 39-й гарадской клінічнай паліклінікі Вольга ЯСМАНЧЫК.**

***— Праз які час трэба рабіць рэвакцынацыю і ці неабходна яна? Якой вакцынай прышчапляцца паўторна?***

**І. Глінская:** — Праз шэсць месяцаў пасля заканчэння поўнага курса вакцынацыі, гэта значыць, праз паўгода пасля другой прышчэпкі можна ўводзіць бустэрную дозу. Аднак пакуль доказная база такая: яна прызначана для асоб са зніжаным імунітэтам. Гэта пацыенты, якія прымаюць адпаведныя прэпараты, ці тыя, у каго імунітэт аслаблены з-за пэўных хвароб. Звестак пра тое, што ўсім неабходна бустэрная доза, пакуль няма. Калі першапачатковая вакцынавалася «Спадарожнікам V», то рэвакцынацыю праводзяць вакцынамі «Спадарожнік Лайт» ці кітайскай Vero Cell, прынцыповых адрозненняў няма.

**«Няма строгіх супрацьпаказанняў да вакцынацыі тым, хто перахварэў. Таму адразу пасля таго, як паправіліся, можна прышчапляцца. Натуральны імунітэт і вакцынацыя забяспечваюць больш надзейную ахову. Паводле іншых рэкамендацый, можна ўстрымацца ад прышчэпкі на працягу трох месяцаў — для роўнага доступу да вакцын».**

***— Калі можна будзе прышчапляць дзяцей?***

**І. Глінская:** — Даследаванні ў дачыненні да дзяцей праводзяцца ў Расіі. Калі яны будуць завершаны, мы разгледзім вакцынацыю ў нашай краіне — не дзяцей, а перш за ўсё падлеткаў.

***— Як тады абараніць дзяцей?***

**І. Глінская:** — Спецыфічнай прафілактыкі няма. Найперш з дапамогай вакцынацыі дарослых, каб у дзіцяці не было шанцаў захварэць дома. Па рашэнні бацькоў дзеці могуць насіць маскі. Можна абмяжоўваць наведванне месцаў масавага збірання, навучыць дзіця мерам сацыяльнага дыстанцыравання, як выкарыстоўваць маску, апрацоўваць рукі.

***— У Расіі спартыўныя і выставачныя манежы пераабсталёўваюць пад шпіталі для інфіцыраваных COVID-19. Чаму такой практыкі няма ў Беларусі?***

**Ю. Горбіч:** — У Расіі былі гарады, дзе не хапала ложкаў у стацыянарах. Нам пакуль іх хапае. І нават калі ўявіць, што мы знойдзем медыцынскае абсталяванне, ложкі і іншае для такіх манежаў, то хто будзе там працаваць? Пакуль у нашых бальніцах месцаў дастаткова. Але на перспектыву мы маем на ўвазе і такі варыянт.

***— Клінічныя выпрабаванні расійскай вакцыны «Спадарожнік V» вядуцца дагэтуль. Ці бяспечна ёй прышчапляцца?***

**Н. Шмялёва:** — Эфектыўнасць гэтай вакцыны неаднаразова пацверджана. Вынікі першай, другой і трэцяй фазы даследаванняў апублікаваныя ў вядучых навуковых часопісах свету. Вакцына зарэгістравана і выкарыстоўваецца ў 70 краінах, дзе жыве больш за чатыры мільярды насельніцтва. Гэта ўсё ж пра многае сведчыць.

***— Дзе знайсці інфармацыю пра «Спадарожнік V»?***

**І. Глінская:** — У адкрытым доступе. Усе ахвотныя, хто ўмее карыстацца інтэрнэтам, без праблем яе знойдуць.

***— Тэмпы вакцынацыі ў Беларусі невысокія. З чым гэта звязана?***

**І. Юркевіч:** — З тым, што многія беларусы занялі чакальную пазіцыю. Прыклад з нашай клінікі. Маці знаходзіцца ў аддзяленні рэанімацыі на апараце штучнага дыхання. Я з дачкой абмяркоўваю тактыку лячэння, пасля пытаю: «Ну вы ж, канешне, прышчапіліся?» Адказвае: «Я лічу вакцыну малавывучанай, я пакуль паназіраю»... Тыповыя адказы многіх нашых пацыентаў: «не паспеў», «збіраўся». Агульнае ўражанне, што гэта характэрная для славян чакальная пазіцыя: пакуль гром не грымне, мужык не перахрысціцца.

**Ю. Горбіч:** — Большасць насельніцтва баіцца ўсяго новага. І цяпер тыя, хто хварэў раней, зноў хварэюць у вялікай колькасці. Яны павінны быць вакцынаваны. Тое, што мы цяпер бачым у стацыянарах, — «таптанне на граблях». Прыкра, што наша насельніцтва лічыць, быццам добра разбіраецца ў медыцыне.

***— Ці можна, перанёсшы каранавірус, адразу прышчапляцца?***

**Н. Шмялёва:** — Няма строгіх супрацьпаказанняў да вакцынацыі тым, хто перахварэў. Таму адразу пасля таго, як паправіліся, можна прышчапляцца. Натуральны імунітэт і вакцынацыя забяспечваюць больш надзейную ахову. Паводле іншых рэкамендацый, можна ўстрымацца ад прышчэпкі на працягу трох месяцаў — для роўнага доступу да вакцын.

***— Як вы ставіцеся да заклікаў вакцынавацца ў пік захваральнасці?***

**Ю. Горбіч:** — Ніхто не ведае, калі захварэе. Можна інфіцыравацца і калі сыдзе хваля захваральнасці. А для выпрацоўкі імунітэту пасля другой прышчэпкі патрэбна два тыдні. Вакцынацыя рэкамендавана ўсім людзям, у якіх няма супрацьпаказанняў. Сярод тых, хто знаходзіцца ў рэанімацыі, амаль няма вакцынаваных — 0,2—05 %. Прышчэпкі — самы бяспечны і эфектыўны сродак прафілактыкі.

***— Колькі часу мы павінны будзем вакцынавацца?***

**Ю. Горбіч:** — На які час спатрэбіцца масавая рэвакцынацыя, невядома. У свеце няма адказу на гэта пытанне.

***— Як пандэмія будзе развівацца далей?***

**І. Юркевіч:** — Занадта многа фактараў, якія на яе ўплываюць, таму спрагназаваць гэта немагчыма. Калі дасягнем узроўню вакцынацыі ў 90 % і вірус не будзе мутаваць, магчыма, яна скончыцца.



**Ю. Горбіч:** — Гэта часткова пацвярджае вопыт Ізраіля, дзе шмат вакцынаваных. І хоць яны і хварэюць, але смяротнасць знізілася ў 30 разоў.

***— Ці праўда, што прышчэпка ад грыпу дазваляе лягчэй перанесці каранавірус?***

**І. Глінская:** — Вакцына ад грыпу абараняе ад грыпу. Мы мяркуем, што грып будзе цыркуляваць у гэтым сезоне, таму мэтазгодна прышчапляцца і ад яго. Ад цяжкага ходу каранавіруса абараняе прышчэпка ад каранавіруса. Кожная вакцына абараняе ад той інфекцыі, супраць якой яна прызначана.

***— На якім тэрміне можна вакцынавацца цяжарным?***

**Ю. Горбіч:** — На любым. У цяперашні час цяжарнасць з'яўляецца фактарам рызыкі, які ўскладняе COVID-19 аж да летальнага зыходу. І карысць ад вакцынацыі перавышае патэнцыяльныя рызыкі. Чаму лічылася, што цяжарных вакцынаваць не трэба? Бо на цяжарных даследаванні не праводзяцца ў прынцыпе. Яны магчымыя толькі ў двух выпадках: калі жанчына хавае ад урача сваю цяжарнасць ці не ведае, што цяжарная.

***— Якімі вакцынамі, акрамя расійскай і кітайскай, можна прышчапіцца ў Беларусі?***

**І. Глінская:** — Толькі названымі: «Спадарожнік V», «Спадарожнік Лайт» і кітайскай Vero Cell. Цяпер вядуцца перагаворы, каб у нашу краіну паступілі вакцыны іншых вытворцаў. Самая лепшая вакцына — тая, якая ўведзена своечасова, каб арганізм паспеў выпрацаваць імунітэт. Можна і пачакаць, але ці здолее такі чалавек не захварэць?

***— Колькі часу чалавек можа знаходзіцца на апараце ШВЛ?***

**І. Юркевіч:** — Канкрэтных тэрмінаў няма. Ёсць выпадкі, калі і 4-5 месяцаў пацыенты знаходзіліся на дыхальным апараце. Пасля яшчэ каля года аднаўляліся. Таму курс вакцынацыі і 1,5 года лячэння і аднаўлення несупастаўляльныя.

**Ю. Горбіч:** — Удакладню, што рашэнне аб адключэнні ад апарата ШВЛ можа прыняць толькі рэаніматолаг. Пра пяць месяцаў мой калега не жартаваў, але ёсць і станоўчыя прыклады, калі пацыенты «злазілі» з ШВЛ праз суткі пасля падключэння, бо прайшлі крытычны перыяд. Апарат ШВЛ — гэта не прыгавор, але і не сродак лячэння. Гэта магчымасць даць арганізму час, каб ён паправіўся.

***— Як змяніліся сімптомы каранавіруса ў сувязі з распаўсюджаннем штама «дэльта»?***

**Н. Шмялёва:** — Калі ў першую хвалю адзін хворы мог заразіць у сярэднім 2-3 чалавекі, то цяпер — ад 5 да 9. Таму неабходна стварэнне імуннай праслойкі, прычым у кароткі тэрмін. Нярэдкія і выпадкі паўторнага інфіцыравання, бо імунітэт няўстойлівы і згасае. І цалкам верагодна, што ад штама «дэльта» будзем прышчапляцца паўторна.

**І. Юркевіч:** — Цяпер захворванне адрозніваецца больш агрэсіўным ходам, больш кароткімі сталі яго стадыі. Калі раней чалавек захворваў паступова, то цяпер 5-6 дзён дастаткова для дасягнення вельмі цяжкага стану. Змяніліся ўзроставыя граніцы: больш хварэе цяжарных жанчын, дзяцей і моладзі. З сімптомаў варта звяртаць увагу на слабасць і высокую тэмпературу і такія аб'ектыўныя паказчыкі, як сатурацыя і артэрыяльны ціск.

**Ю. Горбіч:** — Калі раней пры страце нюху можна было 100 % падазраваць ковід, то цяпер добра, калі ў паловы хворых на яго ёсць такі сімптом. Таму зараз любая ВРВІ — гэта COVID-19, калі не даказана адваротнае.

***— Ці распаўсюджвае вакцынаваны чалавек, які захварэў, каранавірус?***

**Ю. Горбіч:** — Так, нягледзячы на тое, што такія людзі хварэюць бессімптомна ці няцяжка. Таму ўсім варта насіць маскі. Але бонус вакцынаванага — верагоднасць у яго цяжкага ходу хваробы і смерці знізана ў дзясяткі і сотні разоў.

Захварэць ад самой вакцыны немагчыма нават тэарэтычна. Але некаторыя вакцынаваныя захворваюць у першыя два-тры тыдні пасля прышчэпкі. Звязана гэта з «эфектам бясстрашша»: «Я прышчапіўся, таму абаронены, і нарэшце мне можна ўсё: наведваць кінатэатр і спартыўную залу, ездзіць у транспарце без маскі». З-за грэбавання мерамі бяспекі такія людзі і хварэюць, хоць і няцяжка.

**«Большасць насельніцтва баіцца ўсяго новага. І цяпер тыя, хто хварэў раней, зноў хварэюць у вялікай колькасці. Яны павінны быць вакцынаваны. Тое, што мы цяпер бачым у стацыянарах, — «таптанне на граблях». Прыкра, што наша насельніцтва лічыць, быццам добра разбіраецца ў медыцыне».**

***— Ці трэба перад прышчэпкай рабіць аналіз на антыцелы? Адразу пасля хваробы іх узровень у мяне вельмі нізкі...***

**Ю. Горбіч:** — Адсутнасць антыцел не сведчыць, абаронены чалавек ці не. Гэта толькі частка імунітэту. Як вядома, так званы клетачны імунітэт антыцеламі не вызначаецца. На самай справе калі вы перахварэлі, узровень антыцел павінен упасці. Калі мы сустракаемся з узбуджальнікам, ён узлятае. Але арганізм не можа трымаць на высокім узроўні цітры абсалютна ўсіх антыцел. Арыентавацца на іх пры вакцынацыі не рэкамендуецца.

***— Як вызначаюць, што чалавек паправіўся, калі ён лячыўся дома? Ніякіх жа аналізаў не робіцца...***

**В. Ясманчык:** — Нельга сказаць, што ніякіх аналізаў не робіцца. З бессімптомнай формай на бальнічным пацыент знаходзіцца 7-8 сутак. Калі маюцца сімптомы, працягваецца дынамічнае назіранне і лячэнне. Робіцца агульны і біяхімічны аналіз крыві, КТ органаў грудной клеткі, пры неабходнасці іншыя дыягнастычныя абследаванні.

***— А якія абследаванні робяцца перад вакцынацыяй?***

**В. Ясманчык:** — Урач выконвае збор анамнезу, у тым ліку лекавага, каб вызначыць, ці ёсць у пацыента схільнасць да алергічных рэакцый, вызначае хранічныя захворванні. Вымярае тэмпературу, сатурацыю, артэрыяльны ціск. На аснове гэтай інфармацыі прымаецца рашэнне аб магчымасці прышчэпкі і выбары вакцыны. Пасля 30 хвілін пацыент мусіць заставацца каля прышчэпачнага кабінета для кантролю за пабочнымі рэакцыямі.

***— Што з'яўляецца супрацьпаказаннем для вакцынацыі?***

**Ю. Горбіч:** — Дакладнае асноўнае супрацьпаказанне — анафілактычная рэакцыя на першую дозу вакцыны. Многія шукаюць апраўданні не рабіць прышчэпку, маўляў, у мяне хранічнае захворванне. Іх наяўнасць — паказанне да вакцынацыі, бо ёсць рызыкі, што каранавірусная інфекцыя будзе праходзіць цяжэй. Цяпер мы маем вялікі досвед вакцынацыі людзей з рознымі хранічнымі захворваннямі. Так, імунітэт будзе менш інтэнсіўны, але ён выпрацуецца і пры сустрэчы з узбуджальнікам сваю ролю адыграе. Важна абмеркаваць гэта з вашым урачом.

**Алена КРАВЕЦ.**

# АСАБІСТАЯ АДКАЗНАСЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Нарколагі плюсом называюць досыць частую адмову ад курэння як вынік нашэння масак (пах тытунёвага «перагару», пасяляючыся ў «анучы» на твары, адчуваецца самім курцом вострa і непрыемна). А псіхолагі кажуць аб больш рацыянальным выкарыстанні працоўнага часу (людзі ў масках менш адцягваюцца на староннія размовы і флірт). Ну, а галоўны мінус неабходнасці закрываць твар — псіхалагічнае дыстанцыраванне людзей як вынік фізічнага вытрымлівання сацыяльнай дыстанцыі.

## «КАРОНА» І КАРАЛЕВЫ

Мода, як неад'емная частка жыцця, гнутка зрэагавала на «выклікі часу». Маскі сталі ўрадлівай глебай для моднага крэатыву. На подыумах сродкі індывідуальнай аховы ў апошнія гады ператварыліся ў паўнавартасны аксесуар, спосаб прыцягнуць увагу, расставіць акцэнты і падкрэсліць прыгажосць вачэй. Практычна на ўсіх тыднях моды апошніх гадоў, як і ў хроніках стрытстайла, ахоўныя маскі сталі галоўнымі героямі. Так, Fendi выпусціў калекцыю брэндзіраваных масак, кожная з якіх каштуе 190 долараў. Модныя аглядальнікі пішуць, што калекцыя разляцелася як гарачыя піражкі, а «зоркі», што набылі аксесуар, адзначаюць, што здароўе не купіш, а таму трэба сябе абараняць. Marine Serre, чые ўборы выбіраюць Бейёнсэ і Кейт Бланшэт, упрыгожыла ўласную калекцыю масак прынтам «гусіная лапка» і сваёй фірмовай выявай месяца. Дызайн масак распрацаваў і знакаміты брэнд Chanel, як і спецыяльную падарункавую ўпакоўку для іх. Уласнае бачанне маскі прапануюць сёння не толькі модныя дамы, але і музеі. Што ні кажы, гэта — выдатная магчымасць несці мастацтва ў масы. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі не застаўся ўбаку ад сусветнай тэндэнцыі і выпусціў калекцыю ахоўных масак з фрагментамі карцін канца XIX — пачатку XX стагоддзя. У калекцыю ўвайшло пяць масак, на якіх можна пазнаць кавалачкі палотнаў Ілы Машкова («Жаночы партрэт», 1908 і «Нацюрморт з дынямі і гарбузамі», 1915), Язэпа Драздовіча («Астран-абсерваторыя з квадрантам на кальцы Сатурна», 1931), Даніэля Сегерса («Мадонна ў кветках», XIX ст.). Пятым стаў фрагмент японскага пояса обі з усходняй калекцыі музея. У стварэнні ўнікальных масак удзельнічаў вядомы беларускі дызайнер Лёша Лімонаў. Прадаюць такія маскі ў сувенірнай краме музея (трапіць туды можна без білета) па 20 рублёў за экзэмпляр. Нядорага, калі ўлічыць, што гэтая маска можа стаць не толькі стыльным аксесуарам, але і арт-аб'ектам, непаўторнай памяццю аб 20-х гадах XXI стагоддзя — магчыма, вы яшчэ будзеце паказваць яе ўнукам.

Зрэшты, маскі як модны аксесуар можна купіць і ў мас-маркеце — ёсць вельмі мілыя: і яркія, і ў пастэльнай гаме. І з блiскаўкамі, калі вам такое падабаецца. А калі хочаце вылучыцца — пашукайце ў інтэрнэце маскі хэнд-мэйд: прапаноў маса. Як і вучэбных відэа на выпадак, калі вам захочацца адчуць сябе дызайнерам.

Маскі, дарэчы, не адмяняюць макіяж — акцэнт на вочы для славянак хутчэй плюс, чым мінус. Генетычна склалася так, што большасць дзяўчат і жанчын класічнай беларускай знешнасці не можа пахваліцца высокімі скуламі а-ля Анжэліна Джолі. А вось яркія, прыгожага разрэзу вочы з пышнымі вейкамі — як правіла, моцны бок нашай знешнасці. Акрамя таго, правільна падабраная па колеры маска нейтралізуе бледнасць скуры (усё ж такі сонца ў нашых шыротах не хапае) лепш, чым любыя румяны. І надзейна схавае авал твару, які злёгку паплыў, ва ўзроставых паннаў. А яшчэ — знівеліруе так званую няроўнасць усмешак. Некаму ад прыроды дасталіся прыгожыя, роўныя, белыя зубы, а камусьці не так пашанцавала. Ну, а маскі ўраўноўваюць і такім чынам павышаюць самаацэнку.

Дарэчы, ва ўвазе дызайнераў і модных стылістаў да масак няма нічога дзіўнага. Псіхолагі кажуць, што маска дадае ў вобраз элемент таямнічасці, свайго роду разыначку. І робіць чалавека больш расслабленым і непасрэдным у зносінах — яна стварае «экран» паміж вамі і суразмоўцам, зніжае ўзровень трывожнасці і дадае ўпэўненасці.



Прыгожа ўпісаць маску ў модны вобраз — гэта, безумоўна, талент.

## «ЛЮДЗІ НАВУЧЫЛІСЯ СЯБЕ БЕРАГЧЫ»

Пасля нарады ў Палацы незалежнасці, падчас якой Прэзідэнт катэгарычна падкрэсліў, што прымусу да нашэння масак і вакцынацыі ні ў якім разе быць не павінна, абавязковы масачны рэжым у аб'ектах гандлю і грамадскім транспарце быў адменены. «Масачных» рэйдаў эпідэміёлагаў па грамадскіх месцах больш не будзе: вырашана, што важнасць клопату пра сваё здароўе кожны павінен усведамляць сам. А медыкі не прымушаюць, але настойліва рэкамендуюць вытрымліваць сацыяльную дыстанцыю і насіць сродкі індывідуальнай аховы ў грамадскім транспарце, крамах, буйных гандлёвых цэнтрах, на вакзалах і іншых аб'ектах з масавым знаходжаннем людзей. Мы вырашылі праверыць, наколькі свядома нашы суграмадзяне ставяцца да гэтых рэкамендацый.

У гандлёва-забаўляльным цэнтры «Green City» на Каменнай Горцы шматлюдна ў будні і выхадныя. Абсалютная большасць наведвальнікаў у масках, прычым надзетыя яны правільна, не пад носам і не на падбародку. На сёння людзі разумеюць і сур'ёзнасць эпідэміялагічнай сітуацыі, і асабістую адказнасць: перад сабой, сваёй сям'ёй і перад грамадствам у цэлым, адзначаюць сталічныя эпідэміёлагі. Дарэчы, маскі ў грамадскіх месцах рэкамендуюць насіць найперш дарослым. Што датычыцца дзяцей, наяўнасць або адсутнасць гэтага сродку індывідуальнай аховы — на вырашэнне бацькоў. Зрэшты, ужо гадоў з васьмі-дзевяці маска на твары практычна кожнага ўбачанага намі ў ГЗЦ дзіцяці.

У будынку забаўляльнага цэнтра аб неабходнасці насіць маску плакаты нагадваюць літаральна на кожным кроку. На ўваходзе ў прадуктовы гіпермаркет ветлівы ахоўнік карэктна прапануе надзець сродак індывідуальнай аховы «бязмасачным» наведвальнікам.

— Зразумела, маскі ахоўваюць, прычым не толькі ад COVID-19, але і ў цэлым ад сезонных інфекцый, якія перадаюцца паветрана-крапельным шляхам, — кажа **загадчыца аддзела імунапрафілактыкі ДУ «Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна г. Мінска» Наталля НЯДЗВЕДЗЬ**. — Маска патрэбна ў першую чаргу здароваму чалавеку — прадухіліць заражэнне, не дазволіўшы ўдыхнуць паветра з мікраскапічнымі часціцамі сліны хворага. Гэта адна з мер, якія дазваляюць знізіць верагоднасць захварэць. А наогул, усё трэба рабіць у комплексе — і ўсім разам. Дэвізам сённяшняга дня варта лічыць прынцып «Я абаронены, калі іншыя абаронены». Акрамя выкарыстання маскі ў грамадскіх месцах, вытрымлівання сацыяльнай дыстанцыі і дэзынфекцыі рук, важная вакцынацыя ад COVID-19. Так, ні адна вакцына не дае стапрацэнтнай аховы: пацверджаная эфектыўнасць расійскага «Спадарожніка V» — 92 %, кітайскай вакцыны — каля 80 %. Але тыя, хто цяпер знаходзіцца ў бальніцах, 99 % — непрышчэпленыя. І яшчэ адна падстава на карысць прышчэпкі: галоўнае прызначэнне вакцынацыі — папярэджанне цяжкіх наступстваў COVID-19, якія могуць нагадваць аб перанесеным захворванні не адзін год пасля выздараўлення.

Кіраўніцтва гандлёвых аб'ектаў зацікаўлена ў захаванні масачнага рэжыму кожным з работнікаў, адзначае суразмоўца. А работнікі, у сваю чаргу, таксама зацікаўлены ў тым, каб пакупнікі былі ў правільна надзетых сродках індывідуальнай аховы, бо гэта абараняе і прадаўца, і пакупніка.

— Усе супрацоўнікі нашай крамы носяць маскі, — кажа **загадчыца гіпермаркета Green Вольга БОРЫС**. — Мы выконваем маскавы рэжым даўно — з першых дзён з'яўлення каранавіруса. Раней касіры насілі ў абавязковым парадку ахоўны экран, цяпер мы пакінулі гэтую меру на меркаванне кожнага супрацоўніка. На ўваходзе дзяжурыць прадстаўнік службы бяспекі, які просіць надзець маску наведвальнікаў, якія ўваходзяць у краму без яе. У гандлёвай зале размешчаны ёмістасці з дэзсродкамі, і большасць пакупнікоў апрацоўваюць рукі пры ўваходзе ў краму, а таксама пры выхадзе з яе. За касавай лінейкай таксама ўстаноўлены дэзсродкі для пакупнікоў. Акрамя таго, на ўваходзе для ўсіх ахвотных ёсць пальчаткі.



Вольга Мікалаеўна пацвярджае нашы назіранні: у асноўным сёння людзі прыходзяць у крамы ў масках. Адсутнасць гэтага сродка індывідуальнай аховы цяперашняй восенню — рэдкае выключэнне.

— Улетку «бязмасачных» наведвальнікаў было больш. Але мы на ўваходзе, у гандлёвай зале, на касах сталіся нагадваць аб сродках аховы. Бывала, пакупнікоў гэта раздражняла. Але цяпер нарэшце нашы людзі навучыліся сябе берагчы. Кожны разумее адказнасць — за ўласнае здароўе і здароўе тых, хто знаходзіцца побач.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Навука

# «Карона» ці ВРЗ: экспрэс-тэст — у хатніх умовах

**Зараз любы ахвотны можа дома за 10—15 хвілін вызначыць, на што ён захварэў — на COVID-19 або на звычайную прастуду...**

УП «Дзяржразліковая доследная вытворчасць Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» распрацавала і асвоіла вытворчасць экспрэс-тэстаў для якаснага вызначэння наяўнасці антыгену (віруса ў актыўнай фазе захворвання). Экспрэс-тэст SARS-CoV-2-Антыген прызначаны для якаснага вызначэння антыгену віруса SARS-CoV-2 метадам імунахраматаграфічнага аналізу. Экспрэс-тэст дазваляе выявіць антыген каранавіруса ў мазку, узятым з насаглоткі чалавека.

SARS-CoV-2-Антыген прызначаны для выкарыстання медыцынскім персаналам, а таксама для індывідуальнага выкарыстання (у хатніх умовах) пры самакантролі стану падчас вострай рэспіраторнай інфекцыі. Гэта апошняя распрацоўка акадэмічнага прадпрыемства.

Навукоўцамі і спецыялістамі таксама распрацаваны экспрэс-тэст для якаснага вызначэння антыцел (наяўнасці імунітэту падчас або пасля перанесенага захворвання) да каранавіруснай інфекцыі SARS-CoV-2.

Экспрэс-тэсты простыя ў выкарыстанні, не патрабуюць медыцынскай адукацыі і лабараторнага абсталявання для правядзення аналізаў. Зарэгістраваны ў Міністэрстве аховы здароўя і дазволены да вытворчасці, рэалізацыі і медыцынскага прымянення.

Якасць экспрэс-тэстаў пацверджана лабараторнымі даследаваннямі і клінічнымі выпрабаваннямі. У цяперашні час яны пастаўляюцца ва ўстановы аховы здароўя, а таксама ў аптэчныя сеткі і буйныя гандлёвыя сеткі.

Аднак спецыялісты падкрэсліваюць, што экспрэс-тэсты даюць папярэднія вынікі, якія паказваюць на неабходнасць звароту ва ўстанову аховы здароўя для больш паглыбленага абследавання. Тэсты не прызначаны для пастаноўкі дыягназу і выбару лячэння.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона**

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-24117 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный цех) общей площадью 1002,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Минский тракт, 32Ж.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001009305 (целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания квасильно-засолочного цеха) площадью 0,3377 га по адресу: г. Слоним, ул. Минский тракт, 32Ж.
Начальная цена продажи лота 42 840 руб. (сорок две тысячи восемьсот сорок рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 4 284 руб. (четыре тысячи двести восемьдесят четыре рубля)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Слонимский филиал Гроднооблпотребобщества, 231800, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-663-38

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 10 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 09.02.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 08 ноября 2021 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».*
https://grino.by/aukcion/

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

Извещает о внесении изменений в извещение о проведении аукциона, который состоится 05.11.2021, по продаже имущества ОАО «Стройгаз, г. Брест» следующего содержания:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 7 092,00 | **Размер задатка, руб.** | 354,60 |

Телефоны для справок: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Стройгаз, г. Брест» опубликовано в газете «Звязда» от 21.10.2021.

УНП 201028245

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Сяргею і Надзеі Расолькам з прычыны напаткаўшага іх вялікага гора — смерці МАЦІ і СВЕКРЫВІ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 25 ноября 2021 года проводит 22-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 280 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (130) скл. с/о 24 на ЗиЛ–130, ш. 1938712, дв. 540234, 1982 г., 4 кат., 44436 км, 626,53 м/ч | н. п. Красный Берег, в/ч 55461 | 5 200,00 | 1 040,00 |
| 281 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (130) скл. с/о 176 на ЗиЛ–130, ш. 2037328, дв. 744121, 1982 г., 4 кат., 34481 км, 2518,7 м/ч | н. п. Красный Берег, в/ч 55461 | 5 200,00 | 1 040,00 |
| 282 | Автошасси ГАЗ-66 с кузовом фургоном К1.66, ш. 0437693, д. 260036-85, 1985 г., 2 кат., 1612 км | г. Гродно, в/ч 2141 | 5 400,00 | 1 080,00 |
| 283 | Грузовой фургон ZIL 131H, кузов(рама). № 838560, рег. № АО 8984-7, 1989 г., пробег 3567 км | ГААСУ «Авиация» МЧС РБ, г. Минск, ул. Липковская, 12 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 284 | Грузовой автотопливозаправщик MAZ 5334-TZA 7,5, кузов(рама), № 126535, рег. № АК 9636-3, 1990 г., пробег 31790 км | ГААСУ «Авиация» МЧС РБ, г. Минск, ул. Липковская, 12 | 13 615,00 | 2 723,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 25 ноября 2021 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 22 ноября 2021 года. Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 25 ноября 2021 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу: (017) 319 35 41. Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/.

## Извещение о проведении публичных торгов

| | |
|---|---|
| **Форма (вид) публичных торгов** | Открытый конкурс |
| **Организатор торгов** | ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» |
| **Предмет торгов** | Право на заключение договора купли-продажи доли в уставном фонде ООО «СанБридж» |
| **Способ и порядок проведения публичных торгов** | Сбор и анализ конкурсной комиссией конкурсных предложений, оформленных на бумажном носителе и поступивших по почтовому адресу ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» |
| **Начальная цена предмета торгов** | 1 000 000 белорусских рублей |
| **Дата и место проведения торгов** | Срок для приема конкурсных предложений: с 24.10.2021 по 23.11.2021. Вскрытие и анализ конкурсной комиссией конкурсных предложений и определение победителя торгов 25.11.2021 в 11.00 по адресу г. Минск, ул. Фабрициуса, д. 8В, каб. 411 |
| **Способ и порядок определения победителя торгов** | Победителем торгов является лицо, определенное конкурсной комиссией и набравшее наибольшее количество баллов, согласно Условиям проведения конкурса по выбору победителя конкурса на право заключения договора купли-продажи доли в уставном фонде ООО «СанБридж» |
| **Порядок оформления конкурсного претендента для участия в торгах** | Внесение задатка в размере 325 000 белорусских рублей на счет ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», предоставление конкурсного предложения в соответствии с Условиями проведения конкурса по выбору победителя конкурса на право заключения договора купли-продажи доли в уставном фонде ООО «СанБридж» |
| **Срок заключения договора купли-продажи доли в уставном фонде ООО «СанБридж»** | В течение 30 рабочих дней с момента определения победителя конкурса |
| **Основной актив ООО «СанБридж»** | Не завершенный строительством объект «Культурно-оздоровительный центр с гостиницей в районе ул. Нововиленской и Канатного переулка в г. Минске» |
| **Основные кредиторы ООО «СанБридж»** | ПАО Сбербанк, ОАО «Белинвестбанк», ОАО «БПС-Сбербанк» |
| **Срок исполнения договорной документации** | Не позднее 4 месяцев с момента определения победителя конкурса |
| **Подробная информация о конкурсе** | www.bieng.by |

УНП 191450284

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: не завершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения) площадью 2754,0 кв. м, расположенного по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025 площадью 0,2478 га.

| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **63 280,00** | **Размер задатка, руб.** | **6 328,00** |
|---|---|---|---|

**Лот № 2:** капитальное строение с инвентарным номером 132/С-18900 (наименование: не завершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения) площадью 6795,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивановский р-н, Мохровский с/с, д. Завышье, ул. Завышанская, 3/3, на земельном участке с кадастровым номером 123085001401000041 площадью 0,2488 га

| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **301 600,00** | **Размер задатка, руб.** | **30 160,00** |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», 225027, Брестская область, Брестский р-н, район п. Берестье, т/ф 80162941334. **Условия продажи:** без условий. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует расходы на проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.

**Аукцион состоится 17 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 ноября 2021 г. до 17.00**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукционе.

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 451/С-12988 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание бара), площадью 50,2 кв. м, расположенное по адресу: Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Ленина, 50;
- капитальное строение, инв. № 451/С-15743 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 24,6 м, расположенное по адресу: Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Ленина, 50, водопроводная сеть к зданию бара;
- капитальное строение, инв. № 451/С-15744 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 22,1 м, расположенное по адресу: Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Ленина, 50, канализационная сеть к зданию бара

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422355700002000094 площадью 0,0120 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Ленина, 50

Начальная цена продажи – 1 135,92 руб. (одна тысяча сто тридцать пять рублей девяносто две копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 113 р. (сто тринадцать рублей)

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, тел. 8-01563-216-82

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 17 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.08.2020

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 15 ноября 2021 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### *ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит открытый аукцион по продаже имущества*

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение (здание специализированное складов) с инвентарным номером 600/С-696, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, 20, оздоровительный центр «Свитанок», площадью 3218 кв. м. Составные части и принадлежности: пятиэтажное кирпичное здание оздоровительного центра «Свитанок» со складом 1. Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем. Земельный участок с кадастровым номером 623681700001000027 площадью 1,4980 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен | | | | |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **6 397 200,00** | **Задаток, BYN** | **159 930,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце / организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1, тел. 8 017 284 94 32, факс 8 017 286 76 80 | | | | |
| **Сведения о представителях Продавца для осмотра/ознакомления с предметом повторного аукциона** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» Клюева Анастасия Олеговна, +375 333012630, e-mail: arenda@horizont.bn.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240. ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в повторном аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 8 ноября 2021 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения повторного аукциона** | Аукцион состоится **12 ноября 2021 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

## Открытый аукцион № 19/21 по продаже здания в г. Бобруйск (ул. Чонгарская, 36) и помещения в г. Минск (ул. Уманская, 54)

| Организатор аукциона | ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс + 375 (17) 256-61-35 |
|---|---|

**Аукцион состоится 25.11.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701. Продавец – ЗАО «МТБанк»**

| **№ лота** | **Предмет аукциона** | **Местонахождение** | **Начальная цена продажи лота, USD* с учетом НДС** | **Сумма задатка по лоту, руб.** |
|---|---|---|---|---|
| **1** | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-2631, общая площадь – 364,7 кв. м, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание многофункциональное, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000006000791 площадью 0,0394 га. Административное здание | Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 36 | **94 080** | 9 000 руб. |
| **2** | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-70774007, общая площадь – 181,9 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение. ТЦ «Глобо», 2-й этаж | г. Минск, ул. Уманская, д. 54, пом.106 | **228 000** | 12 000 руб. |

* расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи

| | |
|---|---|
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере 5 процентов от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 22.11.2021 до 17.00** |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>- для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>- для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 19/21 по лоту №_» |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 19/21. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНЫЕ ДАННЫЕ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА:** тел.: + 375 (17) 256-61-35, + 375 (25) 549-86-22 Игорь Садливский, auction@expertiza.by

Более подробную информацию и фото по объекту можно найти на сайте http://www.expertiza.by

# Здароўе і сям'я, мір і парадак

## Сацыёлагі высветлілі, што з'яўляецца самым важным для беларусаў

**Што такое каштоўнасці беларускага грамадства? Чым яны вымяраюцца? Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў прадставіў даследаванне «Каштоўнасны партрэт беларускага грамадства», дзе адказаў на гэтыя пытанні, а таксама высветліў, што самым важным для беларусаў з'яўляюцца здароўе і сям'я, душэўны камфорт, мір і парадак, бяспека і свабода.**

Даследаванне праводзілася на працягу апошняга года. Галоўным крытэрыем каштоўнасці даследчыкі лічылі асабістае стаўленне чалавека да чагосьці — з'явы, свайго жыцця, працэсаў, сітуацыі ў краіне.

— Калі паспрабаваць абагульніць увесь пералік каштоўнасцяў, то іх можна падзяліць на дзве групы: сямейна-індывідуальныя і калектыўныя, або дзяржаваўтваральныя. Сярод індывідуальных каштоўнасцяў даследаванне выявіла прыхільнасць беларусаў да традыцыйных рэчаў — здароўя, сям'і, душэўнага спакою і камфорту. Крыху саступае па папулярнасці матэрыяльны дабрабыт і работа. На перыферыі каштоўнасцяў аказаліся імкненні да ўлады, кар'еры і пытанні ўласнага іміджу. У другой групе каштоўнасцяў амаль для ўсіх беларусаў важнымі аказаліся такія рэчы, як мір, бяспека і свабода. Саступае, але ўваходзіць у топ-5 парадак і справядлівасць. Менш значным аказаўся нацыяналізм, які заняў апошняе месца, — расказвае пра вынікі даследавання **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Святлана АЛЕЙНІКАВА**.

Імкнуліся выявіць сацыёлагі і глыбінныя асновы ідэнтычнасці беларускага грамадства. Гэта тое, з кім атаясамліваюць сябе беларусы і што іх аб'ядноўвае.

— Калі адказаць адным словам, то гэта «тутэйшасць», як казаў класік. Гэта прывязанасць да сваёй зямлі, да месца пражывання, дому, — тлумачыць Святлана Алейнікава. — Менавіта «тутэйшасць» — любоў да зямлі — выходзіць на першае месца. Магутным аб'яднальным фактарам з'яўляецца пачуццё супольнасці з блізкімі, сваім сацыяльным акружэннем, з сябрамі, знаёмымі, сваякамі — з кім мы кантактуем і дзелімся чымсьці важным. Важны фактар, які аб'ядноўвае, — менталітэт, характар, традыцыі, культура. У цэнтры нашага пачуцця супольнасці ляжаць агульныя традыцыі, звычкі, культура, менталітэт. Гэта спецыфічная асаблівасць беларускага грамадства.

Яшчэ адно важнае пытанне, на якое павінна было адказаць даследаванне, — што значыць быць беларусам? Часта нацыянальную або этнічную прыналежнасць атаясамліваюць з кроўным сваяцтвам, прыналежнасцю да пэўнай нацыянальнасці. Беларусы ж лічаць крыху па-іншаму. Самымі папулярнымі былі адказы: «Любіць Беларусь і беларусаў», «Жыць у Беларусі» і «Лічыць сябе беларусам».

— Калі казаць пра дзве важныя групы каштоўнасцяў, то іх асаблівасць у параўнанні з іншымі грамадствамі — гэта баланс. Няма перакосу ў той ці іншы бок, яны раўназначныя для грамадзян. І гэта спецыфіка менавіта перыяду незалежнасці Беларусі, у адрозненне ад савецкіх часоў, калі калектыўныя каштоўнасці ставіліся вышэй за індывідуальныя. У 1990-я быў іншы перакос — у бок індывідуалізму. Цяпер жа назіраецца баланс, — удакладняе Святлана Алейнікава.

— Тое, што ў выбарку 2017 і 2020 года ўвайшлі дзве каштоўнасці — жыццё чалавека і парадак, — сведчыць, што сістэмнай ломкі каштоўнасных арыенціраў не адбылося, — працягвае **загадчык кафедры эканамічнай сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Ірына ЛАШУК**. — Хачу падкрэсліць, што гэтыя каштоўнасці лідзіруюць ва ўсіх узроставых групах. Вядома, каштоўнасці старэйшага пакалення і моладзі не аднолькавыя, і яны не могуць быць аднолькавымі. Напрыклад, каштоўнасць свабоды ў моладзі нашмат вышэйшая, чым у людзей больш старэйшых. Але разлому ў каштоўнасцях пакаленняў не назіраецца.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **склада для хранения материалов (минеральных удобрений) с инв. № 600/С-170635 общей площадью 1 197 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623685800001000446 площадью 0,7004 га** ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Минский район, Шершунский с/с, 26, район д. Новый Двор.**

*Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель т. к. часть участка пл. 0,6977 га расположена в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **110 970,51** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **11 097,00** бел. руб.). *Начальная цена снижена на 20 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 03.08.2021.

Аукцион состоится **11.11.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.11.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. **Тел. для осмотра: 8 (017) 504 83 58, 8 (029) 116 45 00.**

УНН 600068728


# НАРЫХТОЎЧЫ КРЭАТЫЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— І калоць сама ўмею, і рэзаць магу, але, вядома, дай бог усё ўмець, але не ўсё каб рабіць прыйшлося. Для печы самыя лепшыя дровы альховыя. Бярозавыя — таксама непагана, але дыму шмат робяць, і сасна дыміць дужа. Дубовыя — хараша, шмат цяпла даюць і мала дыму, але дуб — гэта «далікатэс». Во як у сям'і мужчыны ёсць белыя, то раней можна было і за саманарыхтоўку дроў узяцца, увогуле, вельмі танна тады абыходзіцца ацяпленне зімой, — перайшоўшы на «смачную» вясковую гаворку, тлумачыць Валянціна Паўлаўна нюансы дрованарыхтоўкі.

Пытаюся, што за мужыкі «белыя». Кажа, гэта, можа, і пенсіянеры, але больш-менш дужыя, каб пацягнуць перавозку, нарэзку, колку дроў. Цяпер, дадае мая суразмоўца, саманарыхтоўка — тая яшчэ «штука»:

— Ехаць трэба ў лясніцтва, што ў цэнтры нашага сельсавета, аграгарадку Буйнавічы. Цяпер такое правіла падчас нарыхтоўкі: у які дзень выпісаў паліва, тады і забірай. А гэта не заўсёды можна падгадаць. Калі і ёсць свой транспарт, то ўсе маладыя ўдзень на рабоце, няма калі ездзіць выпісваць дровы. Калі сваім ходам, то, каб выпісаць іх у лясніцтве, трэба дабрацца яшчэ да Буйнавічаў за 12 кіламетраў. А машыны ў каго няма, то сядай на рэйсавы аўтобус, пасля паўвёскі прайдзі нагамі да канторы лясніцтва, выпішы дровы, а потым думай, як дабрацца назад дадому.

## АЦЯПЛЯЛЬНЫЯ «ЛАЙФХАКІ» СІНПОЛЬЦАЎ

Валянціна Паўлаўна гаворыць, што доўгі час усім сінпольскім вяскоўцам вельмі шанцавала з нарыхтоўкай дроў: мясцовы жыхар працаваў у лясніцтве, дапамагаў аднасяльчанам справіцца з «папяровай работай» па выпісцы дроў, але цяпер не працуе. Людзі нарыхтоўваюць самі, хто як можа. Старэйшына Сініцкага Поля пераконвае: усе мясцовыя пенсіянеры дбаюць аб паліве загадзя, ніякіх ацяпляльных калапсаў не здараецца.

— У маёй ветэранскай арганізацыі «Сінпольскае» — ветэраны працы, самотныя пенсіянеры і тыя, хто не адзінокі, але жыве адзін. Усяго ў арганізацыю аб'ядналіся 60 пажылых вяскоўцаў. Звычайна ў нас традыцыя — калі восенню арганізоўваю разам з работнікамі культуры віншаванне з Днём пажылога чалавека, то ходзім па хатах, а заадно цікаўлюся, як яны падрыхтаваліся да зімы, ці ёсць чым паліць, — дзеліцца Валянціна Паўлаўна.

Кажа, пенсіянеры, асабліва тыя, хто не хочуць дзяцей «напружваць» або зусім адзінокія састарэлыя, карыстаюцца паслугай па прывозцы гатовых колатых дроў.

— Мае бабкі з пенсіі грошы адкладваюць загадзя патроху, рыхтуюцца да ацяпляльнага сезона, потым мы дамаўляемся, і нам прывозяць гатовыя добрыя дровы. Нарыхтоўваць імкнёмся так, каб пра запас, — кажа старэйшына.

Яшчэ павучыцца маладым у дбайнасці гаспадароў старэйшага пакалення.

## ЛЮДЗІ, ШТО ДОРАЦЬ ЦЯПЛО

Увогуле, такія актыўныя грамадзяне, як Валянціна Шукаловіч, для мясцовых — на вагу золата. Старэйшына — аўтарытэт, правераны гадамі жыцця на вёсцы і знаёмы з гаспадарамі. Звяртаюцца людзі з любой праблемай. Але звычайна — святло, цяпло, вада, зямля — іх клопат, вядома, і зіма.

— Старэйшыны своечасова даносяць усе праблемы, якія турбуюць людзей, да старшынь сельсаветаў. Некаторыя ў нас непасрэдна працуюць з камунальнымі, спажывецкімі арганізацыямі раёна, самі могуць тэлефанаваць, каб вырашыць тыя ці іншыя пытанні. Работа выбудаваная так, што ва ўсіх нашых арганізацыях ужо добра ведаюць старэйшын населеных пунктаў. Яны дапамагаюць з нарыхтоўкай усяго неабходнага, каб пажылы чалавек, інвалід перазімавалі добра, — адзначае **старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Тацццяна БЯСПАЛАЯ**.

Увогуле, райсавет пастаянна адсочвае, каму і чым неабходна дапамагчы перад пачаткам зімовага сезона, ацяплення жылля.



Школьнікі Лельчыцкага раёна бяруць удзел у акцыі «Мы абіраем дапамогу пажылым людзям».

— Прапрацавалі работу з лясніцтвамі: вядуць улік грамадзян, якім неабходна паліва на зіму. Людзі самі прыходзяць ці звоняць і запісваюцца. Выбіраюць нават пэўную дату прывозкі дроў, бо многія спецыяльна хочуць падстроіцца пад выплату пенсіі, — тлумачыць Тацццяна Адамаўна.

Старшыня райсавета штодзень аб'язджае населеныя пункты раёна, імкнецца праведаць кожнага пажылога чалавека, каб даведацца, як падрыхтаваны да зімы, ці трэба дапамога. Таму цвёрда ведае: сёння на вёсцы з нарыхтоўкай дроў праблем няма.

У самы пік заказаў паліва перад ацяпляльным сезонам традыцыйна ўзрастае нагрузка на паслугі Лельчыцкага ўчастка Мазырскага філіяла «Гомельаблпаліва». Ішла актыўная нарыхтоўка прадпрыемствамі раёна, дадалася праблема з тэхнікай на нарыхтоўчым участку, збіліся адгрузкі па заказах, утварылася чарга з заказчыкаў паслугі, але нязначная, тлумачаць у раёне. Прапрацавалі тут сёння гэтае пытанне і падключылі іншыя арганізацыі, якія змогуць дапамагчы з выкананнем паслуг «райгарпалу».

## КЛОПАТ АГУЛЬНЫ

Што датычыцца падрыхтоўкі да зімы, зазначае старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў, шмат увагі ўдзяляецца і харчовай бяспецы жыхароў усіх населеных пунктаў:

— У райцэнтры вельмі папулярныя кірмашы сельгаспрадукцыі. На вёсцы, нягледзячы на тое што значная колькасць гаспадароў апрацоўвае і трымае вялікія сельгасучасткі, рэалізацыя садавіны і гародніны таксама запатрабаваная, — кажа Тацццяна Бяспалая. — Фермеры, прыватныя прадпрымальнікі імкнуцца дастаўляць садавіну і гародніну на продаж у кожны населены пункт. Акрамя таго, інваліды, старыя, адзінокія людзі, якія не маюць сіл апрацоўваць прысядзібныя ўчасткі, саджаць гародніну і садавіну, могуць заўсёды заказаць усё неабходнае праз аўталаўку, заяўкі можна пакінуць па тэлефоне.

Старшыня Лельчыцкага райсавета падкрэслівае, наколькі ўдзячная раённым арганізацыям спажыўсаюза і пошты за добрую работу перасоўных пунктаў сувязі, аўталавак.

— Не застаюцца без абслугоўвання жыхары нават самых аддаленых вёсачак. Хачу сказаць дзякуй і нашым людзям. Аўталаўка працуе па заяўках, калі, напрыклад, прыехаў у аддалены населены пункт паштамабіль, і людзі набылі ўсё неабходнае, яны перажываюць, каб не ганяць машыну аўталаўкі да іх дарма, тэлефануюць, папярэджваюць, што сёння можна не ехаць, сэканоміць паліва. Хвалююцца людзі за чужы клопат як за свой. Вось самая адметная рыса старэйшага пакалення, чаго часта не хапае маладому, — дзеліцца Тацццяна Адамаўна.

Яна тлумачыць, што ў сваёй працы надае значную ролю якаснай рабоце аглядальных камісій.

— Яны працуюць на тэрыторыях сельскіх Саветаў два разы на месяц і вельмі дапамагаюць вызначыць і папярэдзіць праблемы людзей, гэта датычыцца і падрыхтоўкі да зімовага перыяду. За дзень падчас работы аглядальнай камісіі наведваем не менш за 15 сем'яў, — звяртае ўвагу кіраўнік райсавета. — На тэрыторыі Стадоліцкага, Буйнавіцкага, Тонежскага сельсаветаў, напрыклад, ёсць шэраг населеных пунктаў, дзе пражываюць усяго некалькі жыхароў, адзінокія старыя. Наведваю іх, высвятляю, што неабходна, прапаную перасяліцца ў больш буйныя вёскі, але людзі не жадаюць пакідаць свой дом, іх можна зразумець. На тэрыторыі раёна ў нас знаходзіцца дзве бальніцы сястрынскага догляду ў аграгарадках Сіманавічы і Буйнавічы. Многіх пераконваю накіравацца туды хоць на зіму. Гэта таксама адзін з варыянтаў вырашэння праблемы нарыхтоўкі паліва, прыпасаў на зіму для нядужага чалавека.

У многіх сельсаветах старшыні самі прывозяць пажылым жыхарам неабходнае з райцэнтра ці аграгарадка. Акрамя таго, у школах створаны своеасаблівыя «цімураўскія атрады»: старшакласнікі складаюць дровы, прыбіраюць гародніну, рыхтуюць участкі да зімы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# НЕВЫПАДКОВЫЯ ВЫПАДКОВАСЦІ ТАЦЦЯНЫ КУБЛІЦКАЙ



**Часта, калі ў поле зроку трапляецца мультфільм беларускай вытворчасці, я лаўлю сябе на некалькіх думках. Па-першае, іх, напэўна, робяць тыя, хто вельмі любіць дзяцей. Па-другое, уменне гаварыць з самай патрабавальнай аўдыторыяй цікавае: прывіваць ім любоў да роднага і вечных каштоўнасцяў — майстэрства вышэйшага пілатажу. А калі ўбачанае на экране яшчэ і кранае, часам нават да слёз, то проста захапляешся сапраўднымі прафесіяналамі. Адным з такіх з'яўляецца і мая суразмоўца — мастак-пастаноўшчык, сцэнарыст, рэжысёр-пастаноўшчык студыі анімацыйных фільмаў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Таццяна КУБЛІЦКАЯ.**

## КОЖНЫ РАЗ СТВАРАЕМ НОВЫ СВЕТ

***— Таццяна Васільеўна, сёлета беларуская мультыплікацыя адзначае 50-годдзе. Якія вашы адчуванні і ацэнкі адносна таго, што мы маем і куды рухаемся?***

— Добра, што ў Беларусі ёсць студыя анімацыйных фільмаў. Бо кінавытворчасць і анімацыя ў прыватнасці — вельмі дарагое задавальненне. Тут патрабуецца ўвага і фінансавыя выдаткі. І тое, што ўдалося захаваць гэтую вытворчасць (а перажывалі мы розныя часы), гэта вялікі плюс. Для краіны ў тым ліку. Таму што беларуская анімацыя пазнавальная: у нас добрыя майстры, і, пераглядаючы некаторыя работы калег, я адчуваю гонар за іх. Што будзе далей — ніхто не ведае, але тое, што студыя праіснавала паўстагоддзя і працягвае жыць — заслуга ўсіх, хто працаваў і працуе тут. Я бязмежна ўдзячная ўсім, хто меў дачыненне да з'яўлення маіх фільмаў.

Мабыць, калі сабраць іх разам, то нават атрымаецца запоўніць невялікую кіназалу. Часта мы працавалі проста на энтузіязме, і я адчувала такую падтрымку, без якой проста ўвогуле нічога не атрымалася б.

Вельмі ўдзячная за супрацоўніцтва Уладзіміру Кандрусевічу, з якім мы рабілі музыку для некаторых маіх мультыплікацыйных фільмаў, а «Песні жаўрука» і «Паданне пра гуслі» былі б не такімі кранальныя і паэтычныя без жывой музыкі Леаніда Паўлёнка і калектыву «Нагуаль». Акцёры, маё дзяўчаты-мастачкі і ўсе, з кім мы былі адзіным творчым калектывам, яны давалі веру ў поспех і перакананне, што побач тыя, на каго можна разлічваць.

***— А як вы прыйшлі на «Беларусьфільм»? Выбар прафесіі быў па закліку сэрца?***

— Я апынулася тут выпадкова, па размеркаванні. Гэта былі 1980-я гады. Але на тэлеэкране мне часцей за ўсё трапляліся дастаткова простыя работы (я па адукацыі мастак), і яны не надта ўражвалі. А потым мяне размеркавалі на «Беларусьфільм». Мы рабілі і прамалёўку, і заліўку. І тое, што мы паглыбляліся ў працэс маляванага мультфільма і праходзілі розныя этапы яго стварэння, дало добры вопыт і ўяўленне пра кухню кінадзейнасці.

***— Відаць, мультыплікацыя ўсё ж зацягнула...***

— Напэўна. Спачатку мы з Алай Мацюшэўскай як мастакі-пастаноўшчыкі зрабілі свой першы лялечны фільм «Як Васіль гаспадарыў», а потым ужо з'явіліся і іншыя карціны. Пайшлі самастойныя работы. З лялькамі было вельмі прыемна працаваць. Спачатку іх заказвалі ў Маскве, майстры-лялечнікі па эскізах рабілі нашых герояў. Так лялька пасля адыгрывала цэлы фільм.

Зараз з'явіліся новыя тэхналогіі аб'ёмнай анімацыі. Але ў любым выпадку пад канец праекта ўсе персанажы ўжо як жывыя, і ты ведаеш, як яны сябе паводзяць, на што яны здольныя.

***— Калі фільм зроблены і вы адпускаеце яго ў свабоднае плаванне, што адчуваеце? Ці адсочваеце, як ацэньваюць яго гледачы і калегі па цэху?***

— Меркаванне гледачоў, калег, безумоўна, важнае для мяне. Але ёсць моманты прынцыповыя, якіх трэба прытрымлівацца. Інакш губляецца сэнс або стыль фільма.

Бывае, калі нешта ў выніку не атрымліваецца так, як хацелася, то першы час нават не можаш глядзець работу. А пасля альбо прымаеш, альбо адчуваеш шкадаванне пры кожным праглядзе.

***— Вы 40 гадоў працуеце ў сферы стварэння мультыплікацыйных фільмаў. Як змяняўся ваш погляд на прафесію і што тут пераважае: творчасць альбо руціна?***

— Руціны тут увогуле няма, бо кожны раз мы ствараем новы свет. Адзінае, што заўсёды думаеш, ці ўдасца паспець зрабіць усё ў тэрмін. І гэта пэўны стрэс. Разам з тым трэба ўлічваць і мастацкі складнік, бо пасля ж нікому не патлумачыш, чаму адно не зрабілі, другое не паспелі і гэтак далей. У любых умовах патрэбна знаходзіць нейкі кампраміс, каб на выхадзе атрымаць добры вынік.

## ЗНАЙСЦІ СВАЁ І НЕ ПАЎТАРЫЦЦА

***— Пераход ад мастака-пастаноўшчыка да рэжысёра вам лёгка даўся?***

— У той перыяд у мяне не было работы як у мастака-пастаноўшчыка. З'явілася нагода зрабіць невялікі фільм, я паспрабавала. Дадатковая адказнасць, безумоўна. Але і новыя магчымасці.

***— А як адбываецца пошук таго самага свайго непаўторнага вобраза, калі ёсць тэма, якую трэба ўвасобіць на экране?***

— Банальныя ідэі, якія ўзнікаюць у першыя моманты (падсвядомасць жа спачатку выдае тое, што ты ўжо недзе бачыў, чытаў, чуў), я адмятаю і заўсёды стаўлю сабе задачу прыдумаць нешта сваё. На мой погляд, тэма вызначае стыль. Для фільма «Вясна ўвосень» па казцы Уладзіміра Караткевіча, вельмі выяўленчай, паэтычнай, рабіла акварэльныя накіды-настроі. Хмуры восеньскі дзень, неспакойнае мора («жахтрызненне») хворага Хлопчыка, Сонца. Часам спачатку працуеш над персанажамі.

Напрыклад, вобраз Бабы-Ягі ў «Ліліпку» доўга не магла знайсці. Персанаж гэты вядомы, але вельмі хацелася не паўтарыцца. Там увогуле толькі тры персанажы, і мне было важна кожны з іх прапрацаваць максімальна дасканала. Тая ж казка «Ліліпка» дзецям вельмі падабаецца. Толькі мне не хацелася, каб герой варыў кагосьці, пра што я адразу сказала аўтару сцэнарыя. Інакш што ж гэта за персанаж атрымаецца? Ён жа, па сутнасці, будзе паводзіць сябе як Баба-Яга. Калі ў дзяцінстве чытала «Канька-Гарбунка», то добра памятаю адчуванне, што мне вельмі не падабалася, калі цар звярыўся і ўсе радуюцца.

Я не разумела, чаму нельга было знайсці іншы варыянт. Таму Ліліпка ў нас ніхто не варыць, а Баба-Яга яго адпусціла, і ў кадры гучыць: «Гэты хлопчык такі добры, што, напэўна, зусім нясмачны».

***— У вашых работах ярка гучыць тэма беларускай культуры. З самага пачатку разумелі, што хочаце ў такім ключы размаўляць з аўдыторыяй?***

— Беларусы маюць арыгінальныя казкі, паданні, легенды, багатую літаратуру. І мы цікавыя іншым сваёй адметнай культурай. Мне важна знаёміць гледачоў з нашымі скарбамі.

***— Мне таксама падабаецца ў вашых работах, што можна знайсці шмат сэнсаў. У тым жа «Паданні пра гуслі» гучыць тэма вайны і здольнасці мастацтва аб'ядноўваць людзей. Як прыдумваеце падачу такіх момантаў, разумеючы, што ваш глядач — дзіцячая аўдыторыя?***

— Калі ўзяць «Паданне пра гуслі», то я раю яго на ўзрост 7+. Мы яшчэ да пандэміі паспелі пабываць на фестывалі ў Беластоку, і там гэты мой фільм стаяў у праграме 10+, і тое добра. Дзеці глядзелі ўважліва і задавалі цікавыя пытанні... Працуючы над гэтым мультфільмам, я ўспаміналa і казкі, і беларускую міфалогію. Там ёсць думка пра тое, што найбольш церпяць ад катаклізмаў самыя безабаронныя — жанчыны і дзеці. Згадвала гісторыю сваёй сям'і.

## ВОПЫТ — КЛЮЧ ДА ЎСЯГО

***— Старонкі асабістай біяграфіі, настрой падчас работы над праектам заўсёды ўплываюць на творчасць?***

— Гэта непазбежна. Ты ствараеш персанаж, і няма ніякай розніцы: гэты хлопчык з далёкага мінулага ці наш сучаснік. Проста вопыт дае разуменне, як герой можа дзейнічаць у пэўных сітуацыях. У «Паданні пра гуслі» дзевяцігадовы хлопчык сыходзіць на пошукі бацькі, які быў на вайне. А калі сцэнарый прачытаў мой брат, то спытаў: «Ён жа старэйшы мужчына ў сям'і, і сышоў?» І пасля гэтага важнага пытання ўзнікла сцэна, дзе герой вымяняе сваю дудку на бохан хлеба (які пакідае маці з малодшымі дзецьмі), а толькі тады адпраўляецца ў дарогу. Вядома, фільм мог існаваць і без гэтай сцэны, але тут вельмі важны жыццёвы момант...

***— Ці адрозніваецца ўспрыманне вашых фільмаў у залежнасці ад таго, аўдыторыя якой краіны яго глядзіць?***

— Рэакцыя на ўбачанае заўсёды крыху розная. Але дзецям цікавы герой, які дапамагае адказаць на свае пытанні, страхі, паказвае прыклад паводзін. У Германіі, напрыклад, вельмі ўважліва ставяцца да адпаведнасці фільмаў узросту гледачоў.

А ў Польшчы мне запомніўся хлопчык, які пасля прагляду «Падання пра гуслі» спытаў: «А чаму хлопчык, які крыўдзіць галоўнага героя, такі злы?» Мне здаецца, калі такія думкі ў дзіцяці ўзніклі, то ў яго ёсць усведамленне каштоўнасці іншага чалавека і для яго важна не нашкодзіць бліжняму.

***— З 25 да 27 кастрычніка пройдзе фестываль «Анімаёўка», дзе вы будзеце ў журы дзіцячага конкурсу анімацыйных фільмаў. Што даюць такія мерапрыемствы наведвальнікам, акрамя адкрыцця новых фільмаў і імёнаў?***

— Лічу, што «Анімаёўка» для Магілёва — сапраўдны падарунак лёсу. Бо кожны раз адчуваеш, як да гэтага мерапрыемства рыхтуецца ўвесь горад: тут цікавыя творчыя калектывы і ўдзельнікі, праграмы на любы густ і адданая праца арганізатараў фестывалю. І людзі прыходзяць і глядзяць тое, што выклікае ў іх інтарэс. Вельмі цікавы і важны досвед атрымліваюць дзеці, якія ўдзельнічаюць у анімацыйным конкурсе альбо ў гуртках выяўленчага мастацтва. Неабавязкова потым яны пойдуць у анімацыю. Але заняткі творчасцю, прагляд добрых фільмаў і іх абмеркаванне абавязкова спрацуе на карысць у будучыні. Незалежна ад абранай прафесіі ўменне глядзець на рэчы з розных ракурсаў і прыдумваць штосьці нестандартнае дапаможа. Важна і тое, што потым мультфільмы з праграмы фестывалю едуць да гледачоў па ўсёй краіне.









**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва суразмоўцы.**

Дызайн

# МОДНА... ПАДКРЭСЛІВАЦЬ СВАЮ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ!

**Студэнт трэцяга курса і паралельна супрацоўнік кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Мікіта ЗАХАРЧУК у Новасібірску на грандфінале XXVI Міжнароднага конкурсу «Сібірскі куцюр'е» ўдастоены звання «Найлепшы ў крэатыўнасці рашэння вобраза». Ён таксама стаў уладальнікам сімвалічнай ўзнагароды конкурсу — «Срэбнага гузіка».**



Мікіта ЗАХАРЧУК з членамі журы конкурсу «Сібірскі куцюр'е» Анастасіяй НЯФЁДАВАЙ, галоўным мастаком электратэатра «Станіслаўскі» (*злева*), і Эмай ВАСІЛЬЕВАЙ, дацэнтам Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай мастацка-прамысловай акадэміі імя А. Л. Шчігліца.



Дарэчы, больш чым чвэрць стагоддзя беларусы не маглі атрымаць права ўзяць удзел у фінішы гэтага грандыёзнага свята моды. Прадстаўнік ВДТУ у «сталіцы Сібіры» падчас майстар-класа «Беларускі касцюм. Уплыў народных матываў на fashion-індустрыю» распавёў пра тэндэнцыі нашай моды і раскрыў тэму народных матываў у аўтарскай калекцыі. З ім пагутарыў карэспандэнт «Звязды».

### Марыў стаць мадэльерам з 6 гадоў

Да поспеху ў Сібіры Мікіта Захарчук перамог на XXX Рэспубліканскім фестывалі-конкурсе «Млын моды». За калекцыю жаночага адзення Sweet Look («Салодкі вобраз») яму ўручылі дыплом II ступені. На «Сібірскім куцюр'е» за гэта ж атрымаў «Срэбны гузік».

— У праекце бралі ўдзел прадстаўнікі сібірскіх рэгіёнаў, а таксама сталіцы Расіі, Казахстана і... Бразіліі. Сярод іх — як вопытныя дызайнеры, так і студэнты, — удакладняе Мікіта.

Ён лічыць, што перамог, бо не проста паказаў калекцыю, якая вельмі спадабалася членам журы, публіцы, журналістам, а прадэманстраваў fashion-перформанс.

— Я прадумаў усё да дробязяў: ад асвятлення, калі будуць выходзіць манекеншчыцы, да відэараду і музыкі. Такое, безумоўна, заўсёды выйграе ў параўнанні з проста паказам, — тлумачыць Мікіта.

Ён сам сшыў усё, што дэманстравалася. Навучыўся шыць ва ўніверсітэце. Сказаў, што, калі стала атрымлівацца, аж да слёз радасці — такой была яго рэакцыя.

Падчас яго шоу ў Сібіры мясцовая спявачка выконвала песню «Бяжы» на беларускай мове. Музычны твор добра дапоўніў прэзентацыю з Беларусі.

Сам ён таксама здзіўляў уласным вобразам.

— Хадзіў у кашулі, якая задам наперад, плюс манікюр — усе здзіўляліся такой смеласці. А для мяне гэта... Як растлумачыць? Проста так зручна і захацелася. І ў Беларусі я перыядычна бачу тую ж «нестандартную» кашулю на хлопцах, дзяўчатах. У гэтым сэнсе беларуская моладзь у параўнанні з расіянамі больш смелая — у сэнсе выбару адзення, — лічыць дызайнер.

Ён вырашыў стаць мадэльерам яшчэ ў шэсць гадоў. Родам з Пінска. Там скончыў сярэднюю школу, займаўся ў мастацкай. Бацькі вельмі далёкія ад мастацтваў, нават ад сферы лёгкай прамысловасці. У віцебскі ўніверсітэт паступіў таму, што даведаўся: менавіта тут самы круты дызайнерскі факультэт.

— У Беларусі невялікі выбар у гэтай сферы. У Гродне — крыху іншы кірунак, у Мінску вучаць на дызайнераў сцэнічных касцюмаў... А вось на дызайнера лёгкай прамысловасці вучаць толькі тут, — разважае малады чалавек.

Старэйшага сына бацькі бачаць рэдка, бо ён вельмі заняты: вучоба, праца, творчасць, падпрацоўкі. Як вавёрка ў коле. Свае



планы запісвае ў папяровы, а не электроны нататнік. Сябры яго празвалі «Чалавек-нататнік».

### Калі яны спяць?

Гаварыць з гэтым хлопцам цікава і складана адначасова. Мы пачалі спрачацца, калі размова зайшла пра ўнісекс у рэчах. Ён сказаў, што гэта нармальна і даўно ўжо прыкмета часу. Маё няведанне таго, што ружовы пяшпачаткова быў колерам мужчынскім, выклікала абурэнне суразмоўцы. Разам з тым Мікіта ўражвае сціпласцю і прастатой.

Ён атрымлівае павышаную стыпендыю, зарплату супрацоўніка, але жыве ў інтэрнацкім пакоі з двума хлопцамі.

— Я ў першую чаргу студэнт, мне 19. Хачу студэнцкага жыцця, — сказаў Мікіта.

Не ўтойвае, што з многімі знаёмымі равеснікамі згубіў стасункі. Некаторых сам перастаў успрымаць як блізкіх. Лічыць, лепш мець два-тры чалавекі, з якімі хочацца бавіць час, быць на сувязі, чым шмат, але чужых па духу, інтарэсах, прынцыпах... Прызнаўся, што не абыходзіцца без зайздрасці да яго поспехаў. Хоць ён усяго дабіваецца сам, не мае багатых мецэнатаў, карысных знаёмстваў.

Як паспявае вучыцца і працаваць у такім вар'яцкім тэмпе — я так і не зразумеў.

На кафедру працаваць прыходзіць а 6 або 7 гадзіне раніцы, сыходзіць позна вечарам. Калі працаваў над стварэннем калекцыі, заходзіў у інтэрнат пасля гадзіны ночы.

Нагрузкі на факультэце вытрымліваюць самыя матываваныя. Дарэчы, Мікіта лічыць, што дызайн — не мастацтва, а ўменне зрабіць нейкі прадмет такім, каб яго купілі: ад адзення да, напрыклад, праса. Сказаў, што ў яго групе, дзе ён староста, на сёння пятнаццаць чалавек, а было 21 — прыкладна трэціна не пацягнулі.

— У інтэрнаце ў вокнах пакояў, дзе жывуць будучыя дызайнеры, святло часта гарыць і па начах, — дзеліцца ён назіраннямі.

### Адкуль мода пайшла...

Напэўна, многія задаваліся пытаннямі: чаму нешта сёлета да сезона абавязкова трэба купіць, каб быць у трэндзе? Чаму перыядычна ўзнікае мода на рэтра? Памятаецца, як раптам стала папулярным мілітары, потым — мяккае і рамантычнае, а пасля — штаны, падобныя на мяшок?.. Хто дыктуе, што нам насіць?

Мадэльер сказаў, што ў яго сярод зорак у свеце моды няма аўтарытэтаў. І на гэты раз пагадзіўся са мной. Я пажартаваў, што хачу насіць гумавыя боты ў горадзе, бо мне так зручна. Мікіта падказаў, што, калі абутак упрыгожыць малюнкам або арнаментам, гэта будзе супер.

— Галоўнае, у гэтым я ўпэўнены, каб тое, што на вас, падкрэслівала індывідуальнасць. І так пра ўсіх. Наконт таго, што па тэлебачанні, у часопісах нешта аб'яўляецца модным, думаю, лепш было б шчыра канстатаваць: так лічыць мадэльер, гэта раіць папулярны жаночы часопіс... — дзеліцца ён думкамі.

На пытанне, ці не будзе ў наступную нашу сустрэчу ў цыліндры, Мікіта адказаў, што гэта залежыць ад настрою. Насіў бы і камбінезон рабочага, ды толькі не можа неабходнага колеру знайсці.

Студэнт вельмі цёпла распавёў пра сваіх выкладчыкаў. Вось яны і ёсць для яго аўтарытэты. У прыватнасці, вядомы мастак Васіль Васільеў.

— Гэты чалавек, упэўнены, не думае пра тое, як прадаць свой твор, а дзеліцца са светам сваім успрыманнем яго. А яшчэ вельмі паважаю кіраўніцу майго конкурснага праекта Людмілу Папкоўскую, настаўніц Таццяну Нагавіцыну і Віялету Някрасаву. Дацэнта кафедры дызайну і моды Людмілу Таракanаву лічу маёй універсітэцкай мамай, — пералічвае Мікіта.

Прызнаўся, што пры паступленні ў выкладчыкаў былі сумненні: ці не памыліўся адрасам? Але яго ўпартасць, талент, працавітасць прывялі да поспеху ў конкурсах. Дарэчы, калекцыю, якую паказаў у Сібіры, ужо раскупілі. Цяпер прадумвае, якой будзе наступная.

Ён удзячны бацькам, што назвалі Мікітам.

— Не ўяўляю сябе з іншым імем. Мікіта мае старажытнагрэчаскае паходжанне, звязана са словам «мікітэс» — у перакладзе «пераможца», — тлумачыць ён.

З Віцебска з'язджаць не збіраецца, яму падабаецца ВДТУ, плануе тут выкладаць і займацца творчасцю.

Мы зноў можам з ім паспрачацца: наўрад ці вядомаму мадэльеру будзе зручна працаваць у правінцыйным горадзе. Але Мікіта са мной не пагодзіцца і прывядзе прыклады, калі знакамітасці пераязджалі ў глыбінку, заставаліся там, адкуль пачыналі кар'еру.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота з асабістага архіва Мікіты ЗАХАРЧУКА.**

Рэтраспектыва

# КІНО ЯК ПРАЦА НАД САБОЙ

**Класіка сусветнага кіно — у праекце Cinemascope, які ў межах кінаклуба «Анталогія» арганізоўвае паказы ў Музеі-майстэрні Заіра Азгура. Аматары кіно маглі сачыць за развіццём праекта з 2009 года, Cinemascope як прыватная ініцыятыва ад пачатку ставіў задачу знаёміць аўдыторыю з артхауснымі фільмамі, выдатнымі рэжысёрамі мінулага і сучаснасці, і гэтая скіраванасць захоўваецца.**

«Анталогія» ад Cinemascope прапануе знаёмства з вялікімі рэжысёрамі свету і дапаможа тым, каго цікавіць кіно, лепш разбірацца ў гэтым відзе мастацтва. Ну а кінагурманы ацэняць падбор стужак і імёнаў, каб яшчэ раз перажыць моманты дзіўных сустрэч, якія паўплывалі на фарміраванне іх поглядаў не толькі на мастацтва, але і на жыццё.

Праект стартуе 22 кастрычніка паказам стужкі 1948 года «Вяроўка» — гэта першы каляровы фільм майстра псіхалагічнага трылера Альфрэда Хічкока, без уяўлення пра работы якога немагчыма наогул разумець гэты жанр. Усяго праект прадставіць сем фільмаў, паказы якіх скончацца толькі ў снежні. Але што гэта за стужкі?

Фільм «Голая выспа» японскага рэжысёра Канэта Сіндо (паказ запланаваны на 29 кастрычніка) у 1961 годзе быў адзначаны Вялікім прызам Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю. На гэтым фестывалі наогул любілі Сіндо, і ўжо ў XXI стагоддзі ў Маскве з'явіўся нават помнік японскаму рэжысёру.

Класік аўтарскага кіно Мікеланджэла Антаніёні неаднаразова быў трыумфатарам Канскага кінафестывалю. Напрыклад, фільм «Прыгода» (глядзім 5 лістапада) быў адзначаны ў 1960 годзе спецпрызам журы. Гэта адна са стужак з так званай трылогіі адчуджэння, пасля якой да рэжысёра прыйшла сусветная слава.

Што значыць стаць асобай у кінематографе, мог бы расказаць амерыканскі акцёр і рэжысёр Джон Касавецiс, які здымаў сваё незалежнае кіно на грошы, заробленыя ў Галівудзе. І меў рацыю! Фільм «Твары», зняты ў 1968 годзе, быў намінаваны на «Оскар» адразу ў трох намінацыях. Ужо ў той час рэжысёр адчуваў праблему распаду інстытута сям'і, пра што апавядае фільм, — а хіба цяпер гэта не актуальна?

Кіно, дзе віруюць пачуцці, не мае тэрміну даўніны. Так і фільмы Франсуа Труфо, аднаго з яркіх прадстаўнікоў французскай «новай хвалі». Напрыклад, фільм «Жуль і Джым» выйшаў у 1961 годзе, але будзе зразумелы гледачам XXI стагоддзя (паказ 3 снежня).

Зусім іншая сістэма адносінаў — у фільме «Выканаўца зароку» (10 снежня) бразільскага рэжысёра Анселму Дуартэ. Фільм 1962 года быў адзначаны «Залатой пальмавай галінкай» на Канскім кінафестывалі, атрымаў шэраг прызоў на іншых, у тым ліку намінацыю на «Оскар» за найлепшы фільм на замежнай мове. Такое кіно ўваходзіць у гісторыю чалавецтва, таму што ўзнімае вечныя тэмы: што ёсць вера, як яна ўплывае на чалавека?

Ну і як жа такая падборка без Федэрыка Феліні? Яго фільм «Амакорд», зняты ў 1973-м, быў адзначаны прэміяй «Оскар». Але для Феліні, які выступіў тут яшчэ і як сцэнарыст, гэта фільм-успамін пра італьянскі горад, дзе ён рос у 30-я гады XX стагоддзя, калі складаныя для чалавецтва часы былі наперадзе... 17 снежня кожны можа адчуць той час, згадаць горад свайго дзяцінства і яго атмасферу.

Наогул, усе фільмы нібыта пра нас — без спасылкі на месца і час. Хіба што сучасная атмасфера паказаў будзе адметная абавязковым масачным рэжымам. Але атмасфера саміх фільмаў захаваецца: кіно дэманструецца на мове арыгінала з субцітрамі і з выкарыстаннем бесправаднвх слухавак. Глядзіце добрае кіно, яно дапамагае зразумець жыццё.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ГАСТЕЛЛОВСКОЕ» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

**Лот № 1:**

**– здание телятника** *(одноэтажное кирпичное здание телятника с тремя пристройками, площадкой и ограждением)*, **инв. № 600/С-164199 общей площадью 1 642,3 кв. м;**

**– сенажная траншея, инв. № 600/С-165208 общей площадью 960 кв. м;**

**– сенажная траншея, инв. № 600/С-165210 общей площадью 840 кв. м.**

**Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 623686600001001069 площадью 1,9112 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Минский район, Сеницкий с/с, район д. Кохановщина.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: специальная охранная зона в зоне отдыха реки Птичь, пл. 1,9112 га; водоохранная зона водохранилища Русиновичи, пл. 1,9112 га; водоохранная зона реки Птичь, пл. 1,7169 га; водоохранная зона ручья № 52, пл. 0,1943 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0303 га; контролируемая зона в придорожной полосе автомобильной дороги, пл. 0,8701 га.*

**Начальная цена с НДС (20 %) – 316 628,95 бел. руб. Задаток – 10 % от начальной цены – 31 662,00 бел. руб.**

**Лот № 2:**

**– здание коровника № 1** *(одноэтажное кирпичное здание коровника с пристройкой)*, **инв. № 600/С-164197 общей площадью 1959,9 кв. м;**

**– здание коровника № 2** *(одноэтажное кирпичное здание коровника)*, **инв. № 600/С-164198, общей площадью 1763,1 кв. м.**

**Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 623686600001001070 площадью 4,3734 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Минский район, Сеницкий с/с, район д. Кохановщина.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: специальная охранная зона в зоне отдыха реки Птичь, пл. 4,3734 га; водоохранная зона реки Птичь, пл. 0,7203 га; водоохранная зона ручья 52, пл. 3,6531 га; водоохранная зона водохранилища Русиновичи, пл. 4,3734 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0604 га; контролируемая зона в придорожной полосе автомобильной дороги, пл. 1,1375 га.*

**Начальная цена с НДС (20 %) – 445 011,05 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – 44 501,00 бел. руб.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001693 30000 в ЦБУ № 701ОАО«Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **25.11.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.11.2021** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу. **Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНН600041944

## Извещение о проведении 9 ноября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| |
|---|
| **Предмет торгов № 1** |
| Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-63596 общей площадью 12 555,8 кв. м (наименование – здание административно-бытовых и вспомогательных помещений МАЗ по ул. Машиностроителей; назначение – здание административно-хозяйственное); инженерные сети (общие затраты); теплотрасса; наружные сети ливневой канализации; наружные сети фекальной канализации, наружные сети водопровода; ограждение АБК АЗ; благоустройство; логотип ЗУБР; система ПТО ПТ 7637; монорельс ПТ 7735; монорельс ПТ 7648; кран подвесной мод. ПТ 6946-03.00.000 (5 шт.); шкаф ШРС 1-26 |
| Местонахождение: г. Минск, пр-т Партизанский, 154А |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,3887 га, кадастровый номер 500000000002009005, назначение – земельный участок для обслуживание незавершенного законсервированного капитального строения |
| Начальная цена: 5 832 411,84 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 583 000,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов № 2** |
| Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 700/U-83233 общей площадью 20354,4 кв. м (наименование – здание корпуса № 2; назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения)) |
| Местонахождение: г. Могилев, ул. Крупской, 232 |
| Сведения о земельном участке: площадь – 4,2069 га, кадастровый номер 740100000002005878, назначение – земельный участок для обслуживания незавершенного законсервированного здания корпуса № 2 |
| Начальная цена: 1 044 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 104 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск, тел. (017) 217-98-09.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя – 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 09 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г.Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 25.10.2021 по 05.11.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г.Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

# РУП «Торговый дом «Восточный»

### извещает о проведении 25.11.2021 г. открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25478 общей площадью 193,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 228/15. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: гараж. Составные части и принадлежности: гараж металлический (А1/м). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 19 612,80 бел. рубля, задаток – 1 961,28 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25471 общей площадью 302,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 228/16. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: гараж. Составные части и принадлежности: гараж металлический (Д1/м). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 30 067,40 бел. рубля, задаток – 3 006,74 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105 площадью 0,0676 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, СТ «Монолит-92», У-109. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства (право собственности). **Начальная цена продажи – 2 967,64 бел. рубля, задаток – 296,76 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Недвижимое имущество: несамоходная баржа-площадка для перевозки минерально-строительных грузов, контейнеров и тяжелой техники «Р-0577»; регистровый номер Б-6734; год постройки-1990; проект №775; порт приписки – РТУП «Белорусское речное пароходство речной порт Речица». **Начальная цена продажи – 249 840,00 бел. рублей, задаток – 24 984,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-27942 общей площадью 1 401,00 кв. м. (общая площадь согласно ведомости технических характеристик по состоянию на 24.06.2021 – 1 389,7 кв. м.), расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 17В. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административное здание. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное административное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620850100014000867 площадью 0,193 га (право постоянного пользования). *В отношении частей капитального строения имеются действующие договоры аренды.* **Начальная цена продажи – 573 480,00 бел. рублей, размер задатка – 57 348,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 332/С-121165 общей площадью 365,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Житковичи, ул. Хвойная, 17. Назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: здание столовой. Составные части и принадлежности: подвал. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321650100002000830 площадью 0,1167 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 72 792,00 бел. рублей, задаток – 7 279,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-49589 общей площадью 48,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, СТ «РАДУГА», ст. Вязынка, 47. Назначение: садовый, дачный домик (дача); наименование: садовый домик. Составные части и принадлежности: теневой навес, блочный сарай, мансардный этаж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623883700034000068 площадью 0,0601 га (право собственности). **Начальная цена продажи – 23 300,00 бел. рублей, задаток – 2 330,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-34854 площадью 59,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Новобазарная, 3Б. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: диспетчерская. Составные части и принадлежности: одноэтажное бревенчатое здание диспетчерской А 1/д. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620450100001003068 площадью 0,2948 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 10 011,60 бел. рубля, задаток – 1 001,16 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-37875 площадью 72,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Новобазарная, 3Б/4. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание кузницы. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание кузницы А1/к. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620450100001003068 площадью 0,2948 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 8 262,00 бел. рублей, задаток – 826,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-37778 площадью 19,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Новобазарная, 3Б/3. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: гардероб-бытовка. Составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание гардероб-бытовка А 1/бл. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620450100001003068 площадью 0,2948 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 3 975,48 бел. рубля, задаток – 397,55 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-34852 площадью 166,9 кв. м., расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Новобазарная, 3Б/1. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: цех по изготовлению памятников. Составные части и принадлежности: одноэтажное бревенчатое здание цеха по изготовлению памятников А 1/д с пристройкой Б 1/к, пристройкой В 1/к, тамбуром 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620450100001003068 площадью 0,2948 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 16 426,80 бел. рубля, размер задатка – 1 642,68 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 622/С-47447 общей площадью 577,6 кв. м., расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, аг. Деревная, ул. Мелиораторов, 6А/9. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: здание пилорамы. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание пилорамы А1/к с подвалом (А1/к), навесом 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625485802601000535 площадью 8,1055 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 71 064,00 бел. рублей, задаток – 7 106,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 622/С-47448 общей площадью 90,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, аг. Деревная, ул. Мелиораторов, 6А/10. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: здание сушилки. Составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание сушилки А1/бл. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625485802601000535 площадью 8,1055 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 18 360,00 бел. рублей, задаток – 1 836,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-26075 общей площадью 944,0 кв. м *(общая площадь в соответствии с копией технического паспорта, составленного по состоянию на 16.11.2020: 889,9 кв. м)*. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад, Е 1/к. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000008002190 площадью 2,0948 га (право постоянного пользования) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 131. *На объекте имеется арендатор.* **Начальная цена продажи – 396 576,00 бел. рублей, задаток – 39 657,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Единый объект недвижимого имущества в составе:

изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-177527 общей площадью 595,7 кв. м., расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Подгорная, 10-1. Назначение: административное помещение; наименование: административное помещение (часть капитального строения с инвентарным номером 350/С-82507);

изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-177532 общей площадью 538,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Подгорная, 10-2. Назначение: помещение неустановленного назначения; наименование: помещение неустановленного назначения (часть капитального строения с инвентарным номером 350/С-82507);

капитальное строение с инвентарным номером 350/С-160810, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000001005598 (присвоен предварительно). Назначение: сооружение специализированное энергетики; наименование: тепловая сеть. *Составные части и принадлежности: подземная бесканальная водяная сеть, состоящая из 8 элементов минимальной глубины прокладки – 0,54 м, максимальной глубиной прокладки – 2 м, общей протяженностью 55,7 м, колодцев (камер) – 5 шт. (тепловая сеть от места врезки до административного здания по ул. Подгорная, 10).* **Начальная цена продажи – 379 584,00 бел. рублей, размер задатка – 37 958,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 25.11.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявления на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (отдел по реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 22.11.2021 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 25 ноября 2021 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 44 763 62 63.**

# ЗУБЫ НА ПАЛІЦУ

## Чаму разгарнуўся глабальны дэфіцыт?

**Свет амаль прызвычаіўся да ковіду і падрыхтаваўся нагнаць упушчанае. Але аднаўленне стала пад пытаннем. Аказалася, што сусветная эканоміка не гатовая да бурнага росту. У крамах пустыя паліцы, месяцамі даводзіцца чакаць заказаную мэблю, машыну ці халадзільнік. Бум заспеў бізнес знянацку. Не хапае ўсяго: сыравіны і чыпаў, фур і кантэйнеравозаў, а галоўнае — работнікаў, гатовых вярнуць эканоміку да жыцця пасля паўтара года летаргічнага ковіднага сну, заўважае «Бі-бі-сі». Татальны дэфіцыт стрымлівае эканамічны рост, разганяе інфляцыю і перашкаджае выйсці з крызісу ўсім: і прышчэпленаму Захаду, і краінам, якія развіваюцца, дзе са смяротнасцю і вакцынацыяй па-ранейшаму ўсё складана. Чаму разгарнуўся глабальны дэфіцыт і калі вырашыцца гэтая праблема?**

### ПОПЫТ І ПРАПАНАВАННЕ

Паўтара года пандэміі прарэдзілі армію работнікаў на планеце. Хтосьці памёр, хтосьці не давучыўся, хтосьці перагледзеў жыццёвыя арыенціры. Прапанаванне працоўнай сілы скарацілася. Попыт на работнікаў таксама зменшыўся: за час пандэміі было страчана сотні мільёнаў працоўных месяцаў, і да гэтага часу іх прыкладна на 110 млн менш, чым да ковіду. Аднак адно другое не



**У эканоміку бесцырымонна ўмешваецца палітыка. Дзякуючы гандлёвым абмежаванням дзяржавы шантажыруюць адна адну, патрабуюць ад суседзяў змяніць заканадаўства, караюць геапалітычных апанентаў, заўважыў брытанскі часопіс The Economist. Як адзначыла выданне, наогул увесь свет пераходзіць ад глабальнага мыслення да эканамічнага нацыяналізму.**

кампенсуе: дызайнер, які страціў работу, не заўсёды гатовы замяніць санітарку, якая з'ехала з краіны. У выніку ўнушальныя кагорты спецыялістаў папаўняюць шэрагі беспрацоўных або зусім выбываюць з працоўнай сілы, а цэлыя галіны накшталт гасцінічнага бізнесу або транспарту сутыкаюцца з дэфіцытам работнікаў. Гэта значыць, адначасова скарачаюцца і даходы насельніцтва, і прыбытак бізнесу, і падаткі, і спажыванне, і зберажэнні — эканоміка тармозіць.

Кампаніі вымушаны павышаць заробкі і выплачваць бонусы: напрыклад, сеткі супермаркетаў Tesco і электронікі Dixons Carphone абяцаюць па 1,5 тысячы фунтаў тым кіроўцам, якія прыйдуць да іх працаваць, і сваім, каб не сыходзілі да канкурэнтаў. Amazon плаціць тысячу фунтаў пры найме работнікаў у некаторыя размеркавальныя цэнтры.

Выдатна, радуюцца чыноўнікі: нарэшце зарплаты вырастуць, а з імі — дабрабыт насельніцтва і падаткі ў казну. Нічога добрага, парыруюць крытыкі, — кольказсць работнікаў ад гэтага не павялічваецца, кампаніі проста перакупляюць існуючых адна ў адной, заўважыла «Бі-бі-сі». Гэта новыя выдаткі на падтрыманне, а не пашырэнне бізнесу, і ўслед за выдаткамі непазбежна вырастуць цэны, папярэджваюць яны. Тым больш што, акрамя працоўнай сілы, бізнесу даводзіцца больш выдаткоўваць яшчэ і на сыравіну, камплектуючыя, перавозку і складаванне.

### ДАСТАЎКА ПАД ПЫТАННЕМ

Мала вырабіць запатрабаваную прадукцыю — яе трэба перш спакаваць, каб прадаць. А цяпер гэта дорага ці недаступна, паколькі ўслед за попытам узляцелі цэны на макулатуру, кукурузны крухмал і іншую сыравіну, якая ўжываецца ў пакаванні. І гэта толькі адзін прыклад. Іншы, які на слыху, — чыпы. Паўправаднікоў не хапае да такой ступені, што вядучы сусветны аўтавытворца Toyota скараціў выпуск машын на 40 працэнтаў і закрыў 14 заводаў непасрэдна ў Японіі. На дэфіцыт чыпаў наракаюць усе: ад амерыканскіх Ford і GM да кітайскай Geely і Jaguar Land Rover, брытанскага аддзела індыйскай Tata Motors. Пандэмія агаліла залежнасць Еўропы і ЗША ад паставак чыпаў з Азіі. Цяпер яны спрабуюць узнавіць уласную мікраэлектроніку. Справа не толькі ў павышаным попыце, але і ў перабоях з прапанаваннем, паколькі магутнасці ў Тайландзе, В'етнаме, Малайзіі, на Тайвані і Філіпінах прастойваюць з-за перыядычных лакдаўнаў.

За апошні год цэны на перавозку кантэйнера — галоўнай адзінкі сусветнага гандлю — па самым запатрабаваным у свеце маршруце з Кітая ў ЗША праз Ціхі Акіян узляцелі ў шэсць разоў, а ў Еўропу — у дзесяць! Сітуацыя ўскладняецца перыядычным закрыццём кітайскіх партоў на каранцін. Так, у жніўні ўлады КНР на два тыдні апячаталі кантэйнерны порт Нінбо-Чжоўшань, які ўваходзіць у тройку найбуйнейшых у свеце, як толькі там дыягнаставалі першы і адзіны выпадак «дэльты» — варыянта каранавіруса. Не ўсе аптовыя пакупнікі гатовыя аплачваць дарагую дастаўку, паколькі не ўпэўнены, што змогуць павысіць уласныя рознічныя цэны і адбіць выдаткі. Таму тавары, што не псуюцца, ляжаць на складах, якія і без таго забітыя пад завязку.

Вырашыць праблему за кошт павелічэння прапанавання хутка не ўдасца: нават на пашырэнне складскіх памяшканняў сыходзяць месяцы ўзгадненняў і будаўніцтва. Што ўжо казаць пра пашырэнне гандлёвага флоту — гэта наогул справа многіх гадоў, і ахвотных рызыкнуць закласці дзясятак-другі кантэйнеравозаў у разліку на захаванне павышанага попыту да моманту, калі іх спусцяць на ваду, наўрад ці знойдзецца. «Праблема затораў у сусветных таварных ланцужках наўрад ці вырашыцца ў найбліжэйшы час, асабліва ў момант, калі ключавыя экспарцёры накшталт В'етнама і Інданезіі спрабуюць утаймаваць распаўсюджванне «дэльты», — кажа галоўны азіяцкі аналітык Bloomberg Economics Чанг Шу. — Пастаўкі зрываюцца, цэны ўзрастаюць».

### ЕЖЫ НЕ ХОПІЦЬ

Галоўны вынік дэфіцыту — рост цэн. Ён стрымлівае аднаўленне і тым, што душыць попыт, і тым, што прымушае цэнтрабанкі і ўлады скарачаць грашовае стымуляванне эканомікі за кошт танных крэдытаў і казённых субсідый. Даражэе ўсё, асабліва ежа. Растуць цэны на пальмавы алей, каву, цукар, апельсіны, зерне. І гэта толькі пачатак. «Вельмі верагодна, што інфляцыя спажывецкіх цэн на прадукты харчавання паскорыцца напрыканцы 2021-га і ў 2022-м», — мяркуюць эканамісты Міжнароднага валютнага фонду. Паводле іх прагнозаў, сёлетняе павышэнне аптовых цэн на чвэрць прывядзе да росту рознічных прыкладна на 5 % у найбліжэйшыя два гады, і яшчэ каля 1 % да кошту ежы ў крамах дададуць падаражэлыя перавозкі.

Павелічэнне цэн на прадукты будзе асабліва моцным у краінах, якія развіваюцца, папярэджваюць аналітыкі МВФ. І гэта пры тым, што галоўная праблема — пандэмія — зусім не рассмакталася. За вуглом чакае новая пагроза — мутацыі віруса і зіма — сезон рэспіраторных інфекцый у паўночным паўшар'і. Апытанні бізнесу і спажыўцоў на Захадзе паказваюць, што аднаўленне тармозіць там, дзе яно пачалося на хвалі вакцынацыі, — у ЗША і Вялікабрытаніі, паколькі яны ўжо сутыкнуліся з дэфіцытам. У Японіі і Аўстраліі таксама няпроста з-за «дэльты».

Сусветныя цэны на харчовыя сыравінныя тавары ў верасні зноў выраслі на 1,2 % у параўнанні са жніўнем і амаль на трэць — больш чым на 32 працэнты — з адпаведным часам летась. Такія звесткі ўтрымліваюцца ў распаўсюджаным Харчовай і сельскагаспадарчай Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый (FAO) індэксе харчовых цэн, які адлюстроўвае памесячныя змены міжнародных цэннікаў на асноўныя віды прадуктаў харчавання.

Рост значэння індэкса ў верасні абумоўлены галоўным чынам павелічэннем кошту большасці збожжавых і алеяў. Цэны на малочную прадукцыю і цукар таксама павысіліся. Акрамя таго, прагназуецца, што, нягледзячы на дасягненне гістарычнага максімуму, сусветны



аб'ём вытворчасці збожжавых акажацца ніжэйшы за ўзровень спажывання. Па апошніх даных FAO, адпаведны паказчык складзе рэкордныя 2,8 мільярда тон (у тым ліку рыс у шліфаваным выглядзе), што на 1,1 працэнта больш, чым на канец мінулага года. «Аднак нават на такім узроўні вытворчасць не зможа цалкам пакрыць аб'ём спажывання, які чакаецца ў сезоне 2021—2022 гадоў, што прывядзе да скарачэння запасаў збожжавых у свеце», — адзначаюць эксперты FAO.

Падаражанне энергарэсурсаў і праблемы з пастаўкамі многіх тавараў могуць прывесці да глабальнага крызісу гэтай зімой. Пра гэта напісаў журналіст Bloomberg Майкл Уінфры. На фоне харчовага крызісу амерыканцы запусцілі ў сацсетках чэлендж з заклікам да ўлады звярнуць увагу на праблему. Хэштэг #EmptyShelvesJoe (пустыя паліцы, Джо) збірае ў інтэрнэце тысячы публікацый. Мясцовыя жыхары лічаць, што дэфіцыт прадуктаў пагражае эканоміцы краіны і можа




сарваць калядныя святы. Вінавацяць у сітуацыі, якая склалася, прэзідэнта ЗША Джо Байдэна.

### АХВЯРЫ САНКЦЫЙ

У эканоміку бесцырымонна ўмешваецца палітыка. Дзякуючы гандлёвым абмежаванням дзяржавы шантажыруюць адна адну, патрабуюць ад суседзяў змяніць заканадаўства, караюць геапалітычных апанентаў, заўважыў брытанскі часопіс The Economist. Як адзначыла выданне, наогул увесь свет пераходзіць ад глабальнага мыслення да эканамічнага нацыяналізму. Адзін з яскравых прыкладаў — сітуацыя на калійным рынку. Санкцыі супраць «Беларуськалія», аднаго з найбуйнейшых у свеце экспарцёраў угнаенняў, выклікалі сур'ёзныя праблемы ў еўрапейскіх аграрыяў. Менавіта яны, а таксама спажыўцы прадуктаў харчавання мімаволі становяцца ахвярамі санкцый, паведамў аналітычны партал RuBaltic.ru.

На долю Беларусі прыпадае прыкладна пятая частка сусветнага экспарту калійных угнаенняў. Нават мяккія санкцыі супраць гэтага сектара прывядуць да

**Галоўны вынік дэфіцыту — рост цэн. Ён стрымлівае аднаўленне і тым, што душыць попыт, і тым, што прымушае цэнтрабанкі і ўлады скарачаць грашовае стымуляванне эканомікі за кошт танных крэдытаў і казённых субсідый. Даражэе ўсё, асабліва ежа. Растуць цэны на пальмавы алей, каву, цукар, апельсіны, зерне. І гэта толькі пачатак.**

сур'ёзнага ажыятажу і паўсюднага росту цэн на ўгнаенні. Вырастуць выдаткі фермераў і буйных аграхолдынгаў — пачнуць расці цэны на прадукты харчавання, прагназуюць эксперты. Прычым не выключана, што гэта адбудзецца ў самы непадыходны момант. Напрыклад, падчас чарговай хвалі пандэміі каранавіруса.

Цэны на ўгнаенні стабільна раслі на працягу ўсяго гэтага года, але за апошні месяц яны здзейснілі неверагодны скачок. Гэта наглядна дэманструе свежая публікацыя кампаніі DTN, якая аналізуе інфармацыю аб надвор'і, сельскай гаспадарцы, энергетыцы і таварных рынках у рэжыме рэальнага часу. Найбольш імклівa даражэе карбамід: за тыдзень ён вырас у цане 26 працэнтаў. Калі казаць аб каліі, то яго сярэдні рознічны кошт складае $710 за тону — гэта на 19 % (або на $112) даражэй, чым у мінулым месяцы, ці ў дзвары разы даражэй, чым у пачатку года. Такіх высокіх цэн на калійныя ўгнаенні рынак не бачыў больш за 12 гадоў.

«Выпадальныя» аб'ёмы беларускіх угнаенняў з задавальненнем выкупяць кітайскія, індыйскія, бразільскія фермеры. Але дзе Еўропа знойдзе альтэрнатыўных пастаўшчыкоў?» — адзначыла RuBaltic.ru. Як заўважае партал, еўрапейскія сельгасвытворцы знаходзяцца ў вельмі цяжкіх умовах. Угнаенняў не хапае, цэны кусаюцца. Істотнае падаражанне прадуктаў харчавання — гэта самае бяскрыўднае, што можа пагражаць Старому Свету ў найбліжэйшыя некалькі месяцаў.

**Захар БУРАК.**

# Сапраўдны прафесіянал

## Нялёгкая мацярынская праца

Намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыйнай дзейнасці РУП «Белпошта» Алена Драздовіч і старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі Анжаліка Дробава наведалі сям'ю шматдзетнай мамы Святланы Дзёмкі, якая выхоўвае 10 дзяцей, паштальёна па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі вытворчасці «Мінская пошта». Павіншаваўшы Святлану Мікалаеўну з Днём маці, Алена Васільеўна і Анжаліка Яўгенаўна пажадалі ўсім моцнага здароўя, а шматдзетнай маме цярпення, мудрасці і сіл, каб выхаваць годнае падрастаючае пакаленне, уручылі ёй кветкі, прысмакі і падарункі для дзяцей.

Святлана Мікалаеўна Дзёмка ў 2008 годзе ўганаравана высокай дзяржаўнай узнагародай — ордэна Маці. На пошту яна прыйшла ў 2013-м і ўжо 8 гадоў займае ганаровыя рады паштавікоў. Зараз Святлана Мікалаеўна знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў і хутка плануе вярнуцца на любімую работу.

## Прэзентацыя праекта

18 кастрычніка ў паштовым салоне на паштамце Мінска адбылася прэзентацыя праекта «100 гадоў Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту». У цырымоніі афіцыйнага гашэння прынялі ўдзел міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Канстанцін Шульган і рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Кароль. У гісторыю ўвойдзе канверт з арыгінальнай маркай і спецыяльны памятны штэмпель. Тыраж канверта 20 тысяч. Дызайн Святланы Цырулік.

Датай заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прынята лічыць 30 кастрычніка 1921 года, калі адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны пачатку заняткаў. Першапачаткова ў структуру ўніверсітэта ўваходзілі тры факультэты: рабочы, медыцынскі і грамадскіх навук. Іх студэнтамі ў той час былі 1390 чалавек.

Сёння БДУ — брэнд, якасць якога пацвярджаюць інавацыйныя тэхналогіі ў адукацыі, наймацнейшы прафесарска-выкладчыцкі склад, запатрабаваныя студэнты і выпускнікі. Універсітэт супрацоўнічае з замежнымі ВНУ і штогод паляпшае свае пазіцыі ў сусветных рэйтынгах устаноў вышэйшай адукацыі.

Паштовы праект «100 гадоў Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту» — унікальны спосаб інфармавання пра вядучую навучальную ўстанову краіны.

**Менавіта так ахарактарызавала Святлану Фурс намеснік начальніка АПС «Наваполацк-6» Вольга БІХУНОВА. Па яе словах, гэта самы адказны супрацоўнік аддзялення паштовай сувязі. Што датычыцца чалавечых якасцяў, то Святлана Аляксандраўна — вельмі прыязная, спагадная і камунікабельная калега. За гэта яе цэняць і паважаюць у працоўным калектыве.**

Як расказала Святлана Фурс, на пошце яна працуе 12 гадоў. Раней працавала прадаўцом у гандлі. Але па сямейных абставінах пасля дэкрэтнага водпуску вырашыла знайсці работу, каб заставалася больш часу на выхаванне дзіцяці. Вось і ўладкавалася на пошту, дзе прапанавалі пасаду паштальёна.

— Шчыра кажучы, не чакала, што мяне так цёпла сустрэнуць у калектыве АПС «Наваполацк-6», дзе працую па сённяшні дзень, — расказала Святлана Аляксандраўна. — Адразу замацавалі за мной у якасці настаўніцы адну з найлепшых супрацоўніц Любоў Грышчанку, якая азнаёміла з усімі тонкасцямі прафесіі, за што я ёй вельмі ўдзячна. Зараз Люба ўжо на пенсіі, але мы часта сустракаемся на вуліцы, заўсёды ахвотна паразмаўляем, успомнім гады сумеснай працы.




Па колькасці адрасоў участак мне дастаўся адзін з найцяжэйшых. Ёсць і прыватны сектар, і шматпавярховыя дамы. А яшчэ шмат розных арганізацый, у тым ліку гандлёвых, якія вядуць актыўную перапіску — да іх паступае вялікая карэспандэнцыя. Нялёгка было спачатку абыходзіць участак: увесь гэты час на нагах. Але хутка прывыкла, і цяпер дарога здаецца мне не такой цяжкай. Прывыкла і да людзей, якія пражываюць на маім участку. За гады работы зразумела галоўнае: каб зносіны з кліентамі складваліся ветлівыя і даверныя, да людзей трэба заўсёды ставіцца з павагай і разумець іх. Тым больш што даводзіцца абслугоўваць пераважна пенсіянераў, сярод якіх ёсць і адзінока пражываючыя. Мне заўсёды іх шкада.

Па словах Святланы Аляксандраўны, кожны з такіх кліентаў пазначаны ў яе тэлефоннай кнізе. Перад візітам яна абавязкова звязваецца з пажылымі людзьмі, каб даведацца, што ім у гэты час патрэбна. Акрамя пенсій і карэспандэнцыі, яна дастаўляе дадому прадукты харчавання, тавары паўсядзённага попыту, афармляе падпіску на часопісы і газеты і іншае.

— Мне заўсёды сумна, калі спісы на атрыманне пенсіі на маім участку скарачаюцца, — адзначыла паштальён. — Нават боль адчуваецца, калі разумееш, што чалавек, якога ты ведаеш многія гады, які цябе ўвесь час ветліва сустракаў, да якога прывык, днямі пайшоў з жыцця. Вы не паверыце, але з кліентамі мы як адна вялікая сям'я. Так прыемна, калі людзі тэлефануюць табе, віншуюць са святам ці днём нараджэння. Вось самая прыемная адметнасць маёй працы.

І больш за ўсё я люблю яе за магчымасць дапамагчы людзям, палепшыць ім настрой, хоць не на доўгі час пазбавіць іх адзіноты. Так хочацца, каб усе мае калегі і кліенты былі жывыя, здаровыя і шчаслівыя. Але, на жаль, гэта нязбыўная мара!..

# Сплаў маладосці і вопыту

**Аддзяленне паштовай сувязі «Петрыкаў-2» абслугоўвае ўсіх жыхароў палескага горада. А гэта больш за 10 000 чалавек. У ліку паслуг — прыём плацяжоў, афармленне страховак, правядзенне падпіскі на перыядычныя выданні, рэалізацыя тавараў паўсядзённага попыту і іншае. Хутка з'явіцца і такая паслуга, як «мабільны паштальён», якая дае магчымасць ажыццяўляць плацяжы дома ў кліентаў у рэжыме рэальнага часу.**

Па словах начальніка АПС Алены Юркавец, у аддзяленні створаны ўсе ўмовы як для наведвальнікаў, так і для супрацоўнікаў. Напрыклад, да паслуг кліентаў, якія наведваюць пошту з дзецьмі, створаны дзіцячы куток, дзе малыя могуць пагуляць ці памаляваць, пакуль іх бацькі чакаюць у чарзе. Для работнікаў аддзялення абсталяваны пакой адпачынку, які з'явіўся тут пасля правядзення капітальнага рамонту будынка пошты.

— У штаце нашага аддзялення працуюць сем паштальёнаў — своеасаблівы сплаў маладосці і вопыту, — адзначыла Алена Георгіеўна. — Толькі двое з іх — жанчыны ў сталым узросце, а астатнія — моладзь. Прыемна, што працаваць да нас прыходзяць не толькі дзяўчаты, але і хлопцы. Напрыклад, Руслан Цімошын прыйшоў у аддзяленне адразу пасля заканчэння школы. Працягнуў сямейную традыцыю, бо раней на пошце працавала яго маці. Эдуард Сарнацкі па ўзросце старэйшы за Руслана. Ён ужо працаваў тут раней, але потым вярнуўся ў наш калектыў і вельмі гэтым задаволены.

Маладых супрацоўніц — сясцёр Ніну і Марыю Перапражак — кліенты, асабліва пажылыя, вельмі паважаюць і любяць. Дзяўчаты стварылі асабістую кліенцкую базу і перад кожным выхадам на ўчасткі тэлефануюць людзям і пытаюцца, што неабходна прынесці. А увогуле наш калектыў вельмі дружны, усе працуюць добрасумленна і адказна, — падкрэсліла начальнік АПС.



Начальнік аддзялення Алена ЮРКАВЕЦ і інструктар па падпісцы Ніна ЧЫРЫЧ.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

За работай аператар Марыя КАЛАЕВА.

# ВАС НАВЕДАЕ «МАБІЛЬНЫ ПАШТАЛЬЁН»

**На дапамогу работнікам Дзяржынскага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі прыходзіць сучаснае электроннае абсталяванне.**

— Наш рэгіянальны вузел паштовай сувязі абслугоўвае тры раёны, — паведаміла **начальнік Дзяржынскага РВПС Алена БАДНАРАШАК.** — Дзяржынскі, Стаўбцоўскі і Уздзенскі. Работа наша ўдасканальваецца пастаянна. Усе працэсы аўтаматызуюцца. Напрыклад, нядаўна ўведзена ў дзейнасць сістэма «мабільны паштальён». Прылада, з якой усе паслугі ажыццяўляюцца ў рэжыме анлайн, што вельмі зручна як для насельніцтва, так і для саміх паштальёнаў.

Без ніякіх праблем дома можна выканаць прыём плацяжоў, аформіць падпіску, выдаць паштовае адпраўленне. Сама прылада нагадвае звычайны смартфон з невялікім электронным блокам. Наўпрост дома цяпер можна выканаць плацяжы, іншыя грашовыя аперацыі ў рэжыме рэальнага часу, ажыццявіць продаж спажывецкіх тавараў, прычым не толькі наяўныя грашыма, але і пры дапамозе аплатнай карткі. Ісці ў паштовае аддзяленне цяпер неабавязкова. Асабліва такая паслуга спатрэбілася з пачаткам пандэміі. Для людзей сталага веку яна вельмі зручная.



У аперацыйнай зале АПС «Дзяржынск-2».

Па словах Алены Валер'еўны, больш за 80 % населеных пунктаў трох раёнаў Мінскай вобласці абслугоўваецца пры дапамозе аўтамабіляў. Гэта дае магчымасць аператыўна наведаць кожнага кліента нават у самай аддаленай вёсцы. Вялікія адлегласці пешшу паштальёнам пераадольваць ужо не даводзіцца.

Пастаянна ўдасканальваецца праграмнае забеспячэнне ў аддзяленнях паштовай сувязі, пашыраецца кола так званых няпрофільных паслуг: набыць неабходныя спажывецкія тавары, здзейсніць банкаўскія аперацыі і іншыя.

Калектыў Дзяржынскага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі з улікам супрацоўнікаў Стаўбцоўскага і Уздзенскага ВПС налічвае каля 300 чалавек. Большая частка, зразумела, жанчыны. Мужчыны ў асноўным кіроўцы. Апошнім часам калектыў актыўна папаўняецца маладымі работнікамі. Асабліва гэта заўважна ў аддзяленнях сувязі Дзяржынскага раёна. Вопытныя работнікі пераважаюць у калектыве Уздзенскага ВПС. У Стаўбцоўскім ВПС — 50 на 50.

— Прыемна, што да нас ідзе моладзь, — адзначыла начальнік РВПС. — Кожны год мы прымаем у наш калектыў маладых работнікаў. А нашы вопытныя, заслужаныя супрацоўнікі шчодра дзеляцца з маладымі калегамі сакрэтамі прафесійнага майстэрства.

Сярод нашых найлепшых настаўнікаў — такія вопытныя работнікі, як Марыя Доўжык — і начальнік аддзялення паштовай сувязі, і адначасова паштальён АПС «Волма» — выдатны перадавік сваёй працы; Зінаіда Грыль, начальнік АПС «Данілавічы»; паштальёны Жанна Шамко і Тацціна Грыль і многія іншыя. А яшчэ ў нашам РВПС працуе цэлая дынастыя кіроўцаў паштовых аўтамабіляў — браты Генадзь, Павел і Вадзім Вольскія. На гэтай рабоце яны змянілі свайго бацьку, які, на жаль, ужо пайшоў з жыцця.

Як паведаміла начальнік Дзяржынскага РВПС, у найбліжэйшы час на вуліцах Дзяржынска і Фаніпаля да паслуг насельніцтва з'явяцца паштаматы — прылады для выдачы паштовых адпраўленняў. Атрымаць іх людзі змогуць незалежна ад часу работы пошты. У саміх паштовых аддзяленнях уведзена электронная чарга. Аперацыйныя залы аснашчаны сучасным электронным абсталяваннем.

Кожны год па традыцыі ў калектыве рэгіянальнага вузла сувязі праводзіцца конкурс прафесійнага майстэрства. Пераможцы потым прадстаўляюць РВПС на абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах. А ў маі ў Дзяржынску для работнікаў РВПС адбылося цікавае сямейнае свята з конкурсамі, вікторынамі і канцэртам. Гэта першае мерапрыемства, арганізаванае прафсаюзнай арганізацыяй. Усе яго ўдзельнікі былі вельмі задаволены святочнай праграмай і атрымалі шмат станоўчых эмоцый. Чакаецца, што падобнае сямейнае свята ў будучыні стане традыцыйным, паколькі найлепшым чынам спрыяе добрым адносінам у калектыве і дорыць добры настрой.

Матэрыялы выпуска падрыхтаваў Сяргей РУЧАНАЎ.

Мода або неабходнасць?

# ПРЫГОДЫ КАТА СМУРА

## Ці варта стрыгчы гадаванцаў

**Кот Смур трапіў у сям'ю Бедневых з лёгкай рукі іх ужо дарослай дачкі. Сама дзяўчына ўжо з'ехала ад бацькоў, а вось коцік застаўся...**



Для Вольгі Бедневай догляд ката быў у навінку. Смур — даўгашэрсны кот, і гэта, скажам так, прыносіла некаторыя нязручнасці, а менавіта неабходнасць дадатковай прыборкі поўсці па хаце. Вольга вычэсвала гадаванца сама, пакуль не ўбачыла ў інтэрнэце вясёлыя фота стрыжаных катоў. Ёй так спадабалася гэтая ідэя, што стала шукаць салон, каб даведацца, ці не будзе шкодная яму стрыжка. Так Смур стаў катом, у якога ёсць свой асабісты грумер — майстар Наталля, якая працуе ў адным са сталічных зоасалонаў.

Грумер — спецыяліст па доглядзе хатніх жывёл. Некаторыя лічаць, што стрыгчы ката — гэта нейкае буржуазнае дзівацтва. Але на самай справе цырульнікі сабак і катоў выконваюць цэлы комплекс важных гігіенічных і эстэтычных працэдур па доглядзе жывёл.

Па-першае, грумеры сочаць за здароўем поўсці жывёл: расчэсваюць іх з дапамогай спецыяльных інструментаў і пры неабходнасці выдаляюць каўтуны. Па-другое, грумеры мыюць жывёл спецыяльнымі гіпаалергеннымі шампунямі і кандыцыянерамі, пры гэтым сумяшчаючы такую працэдуру з масажам. І, канешне, грумеры стрыгуць гадаванцаў, падбіраючы індывідуальную стрыжку для кожнай пароды катоў ці сабак.

У Смура таксама ёсць свая каронная стрыжка — пад ільва. Стрыгуць яго нячаста — адзін раз на 7-8 месяцаў. Кот выглядае трошкі разгубленым, калі Вольга дастае яго са спецыяльнага кошыка. Але, як толькі трапляе на спецыяльны грумерскі стол, спрабуе даць адтуль драпа. Грумер Наталля добра ведае звычкі свайго «кліента» і тут жа вельмі далікатна, але пры гэтым настойліва ўтрымлівае яго на стале і пачынае пагладжваць.

— Катам больш камфортна, калі іх вычэсваюць, а не стрыгуць, — кажа Наталля, якая працуе грумерам у зоасалоне ўжо шэсць гадоў. — Стрыжка для іх — заўсёды стрэс. Але часам гэтай працэдуры не пазбегнуць. Так, напрыклад, да нас прыходзяць гаспадары катоў, у якіх выявілася алергія на поўсць, але яны не гатовыя расстацца са сваім гадаванцам і таму прыходзяць да нас па дапамогу. У выніку яны ў нас бываюць раз на 3-4 месяцы. Гэтак жа да нас прыводзяць катоў, схільных да забіцця страўнікаў поўсцю. Каты вельмі ахайныя жывёлы. Яны ўвесь час вылізваюць сябе і ў працэсе з'ядаюць нейкую колькасць поўсці. Часта з'едзеныя такім чынам валасінкі выходзяць натуральным шляхам



і не дастаўляюць гадаванцам непрыемнасцяў. Але калі кот пухнаты, то могуць узнікнуць праблемы. Калі ў страўніку кошкі поўсці будзе зашмат, то яна можа забіць страўнік, і тады спатрэбіцца аперацыя. Каб пазбегнуць гэтага, ветэрынары рэкамендуюць скарыстацца паслугамі грумера.

Смур не мае такіх праблем. Але яго гаспадыня лічыць, што яму вельмі падабаецца быць стрыжаным. Ён становіцца вельмі ласкавы, стараецца прытуліцца да людзей і гучна мурчыць. Скура яго становіцца навобмацак мяккай, аксамітай. І, вядома, поўсці потым яшчэ доўга ў хаце няма. У руках Наталлі Смур ужо супакоіўся. Да грумерскага стала падышла памочніца майстра і таксама стала гладзіць яго. У гэты час грумер дастала спецыяльны прыбор для стрыжкі. Машынка загудзела, і кот устрапянуўся, але Наталля супакоіла яго і пачала стрыгчы спінку. Ён не супраціўляўся і хутка стаў губляць у аб'ёме. Праз некалькі хвілін прыбор заціх, і майстар ўзяла ў рукі кіпцярэзку.

— Кіпцюры стрыгуць катам, каб яны не псавалі мэблю і рэчы ў доме, — тлумачыць грумер. — У нашым салоне гэта працэдура каштуе 5 рублёў. Таксама грумеры могуць пачысціць гадаванцам і вушкі з дапамогай медыцынскіх раствораў. Наша мэта — палепшыць агульны стан гадаванца і зрабіць яму ўсе неабходныя гігіенічныя працэдуры. Самастойна справіцца з комплексам у хатніх умовах многім людзям складана. Аднак бывае, што я вымушана адмаўляцца працаваць з некаторымі жывёламі. Так здараецца, калі гадаванец агрэсіўна сябе паводзіць. Агрэсія ў жывёл здараецца з-за стрэсу ці з-за захворвання. Калі нам не ўдаецца супакоіць «кліента», то дзеля бяспекі мы накіроўваем яго на падобныя працэдуры ў ветэрынарную клініку. Там катоў могуць пастрыгчы пад наркозам. Бывае, што ў катоў поўсць збіваецца ў каўтуны, і калі іх шмат, то стрыжка будзе балючай. У такіх выпадках лепей таксама ісці ў ветклініку. Каўтуны нельга пакідаць на скуры жывёл, бо яна не дыхае, а пры адсутнасці вентыляцыі ўзнікаюць участкі з пачырваненнем і раздражненнем. Можа з'явіцца экзэма, нагнаенне і дэрматыт.

Спецыяліст лічыць, што ўсіх катоў трэба своечасова вычэсваць, тады такой непрыемнасці, як каўтуны, можна пазбегнуць.



Наталля спрытна мяняе кіпцярэзку на нажніцы і састрыгае пучкі поўсці ў падушачак на лапках Смура. Цяпер кот не будзе разносіць напаўняльнік для каціната туалета па доме. Смур зусім расслабіўся. Але раптам зноў пачынае гудзець машынка — грумер узялася стрыгчы пуза. Кату не вельмі падабаецца, калі справа даходзіць да стрыжкі пад лапкамі. Ён супраціўляецца, але з дапамогай памочніцы зафіксаваны і не можа збегчы. Наталля робіць сваю справу вельмі хутка, каб хутчэй вызваліць «нявольніка». Нарэшце стрыжка скончылася. Смур азіраецца ў пошуках знаёмых твараў. Вольга бярэ свайго ката на рукі. Той туліцца да гаспадыні.

— Вусы лічыць не будзе? — смяецца Наталля. — З вас трыццаць рублёў.

Мне падаецца, што Смуру холадна, але Вольга запэўнівае, што ён хутчэй паводзіць сябе так ад стрэсу, а дома хутка супакоіцца. Нягледзячы на тое, што кот рэгулярна наведвае асабістага цырульніка, для яго гэта не любімы занятак. Ён больш любіць мурчаць у кампаніі сваіх родных дамачадцаў. Наталля ж збіраецца рабіць перапынак 15—20 хвілін — такое ў яе правіла, бо перад тым, як заняцца іншым кліентам, трэба мець эмацыянальныя сілы, каб жывёла падчас маніпуляцый адчувала, што майстар спакойны і не зробіць яму нічога дрэннага.

Праз рукі грумера праходзіць 7-8 жывёл за дзень. Але перад летам і восенню колькасць тых, хто хоча пастрыгчы сваіх гадаванцаў, павялічваецца з-за сезоннай лінькі, бо ў гэты перыяд поўсць гадаванцаў літаральна разлятаецца па хаце. Але спецыялісты не раяць без асаблівай неабходнасці стрыгчы катоў, асабліва караткашэрсных. Шарсцянае покрыва кошкі выконвае функцыю тэрмарэгуляцыі, абараняючы арганізм жывёлы ад негатыўнага ўздзеяння навакольнага асяроддзя. Лепей проста рэгулярна мыць і вычэсваць сваіх гадаванцаў, тады яны будуць выглядаць дагледжанымі і пры гэтым поўсці ў доме будзе значна менш.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**



## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN |
|---|---|---|---|
| 1 | Автобус ГАЗ-3307 | 4 704,00 | 470,40 |
| 2 | Экскаватор-погрузчик ЭП-Ф-П | 10 080,00 | 1 008,00 |
| 3 | Автогидроподъемник ВС-22-11, инв. № 998 | 15 876,00 | 1 587,60 |
| 4 | Автокран КС-35714К, инв. № 67 | 34 236,00 | 3 423,60 |
| 5 | Автомашина LADA 21144.110-32, инв. № 84 | 2 484,00 | 248,40 |
| 6 | Автомобиль грузовой бортовой MERCEDES-BENZ, инв. № 55 | 5 292,00 | 529,20 |
| 7 | Автомобиль ГАЗ 32213-288 2сл., инв. № 154 | 3 024,00 | 302,40 |
| 8 | Бетоносмеситель | 18,36 | 1,84 |
| 9 | Бункер БН-1,0 Л | 345,60 | 34,56 |
| 10 | Бункер БП-1 | 100,44 | 10,04 |
| 11 | Бункер БП-1 | 100,44 | 10,04 |
| 12 | Бункер БП-1 18-2.00Б | 399,60 | 39,96 |
| 13 | Емкость для воды | 561,60 | 56,16 |
| 14 | Инструменталка | 518,40 | 51,84 |
| 15 | Компрессор ЗИФ 55В б/у | 3 564,00 | 356,40 |
| 16 | Мусоропровод | 46,44 | 4,64 |
| 17 | Полуприцеп МАЗ-938660-(044) | 3 456,00 | 345,60 |
| 18 | Станок камнерезный СКЭ 350/600 220В Россия | 334,80 | 33,48 |
| 19 | Стол каменщика | 172,80 | 17,28 |
| 20 | Стол каменщика | 172,80 | 17,28 |
| 21 | Теплогенератор мобильный ЕС 55 Италия | 1 058,40 | 105,84 |
| 22 | Трансформатор для прогрева бетона ТСДЗ-80/0 38 УЗ | 399,60 | 39,96 |
| 23 | Трансформаторная подстанция | 1 404,00 | 140,40 |
| 24 | Штукатурная станция | 2 268,00 | 226,80 |
| 25 | Штукатурная станция ШС-4/6 | 3 348,00 | 334,80 |
| 26 | Автомобиль КИА СПОРТЕЙДЖ, инв. № 40 | 20 520,00 | 2 052,00 |

| | |
|---|---|
| В отношении Лотов 1, 2 проводятся вторые повторные торги. Стоимость снижена на 20 %. В отношении Лотов 3–25 проводятся первые повторные торги. Стоимость снижена на 10 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 175 (29544) от 11.09.2021, стр. 6. В отношении Лота 26 проводятся первые торги после оценки | |
| Дата и время проведения торгов | По Лотам 1–25 – **4 ноября 2021 года в 13.00 (регистрация – с 12.30 до 13.00)**<br>По Лоту 26 – **24 ноября 2021 года в 14.30 (регистрация – с 14.00 до 14.30)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| Срок приема заявлений и оплаты задатка | По Лотам 1–25 – с 10:00 23.10.2021 по 16.00 03.11.2021<br>По Лоту 26 – с 10:00 23.10.2021 по 16.00 23.11.2021<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены предмета торгов |
| Местонахождение имущества | Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 |
| Условия для участия в торгах | 1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info/.**<br>2. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту №__, принадлежащему ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых __.11.2021.<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, где указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.<br>**Вознаграждение аукциониста составляет 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов **обращаться к Александру Владимировичу (+375293697036).** По вопросу наличия обременений обращаться к Ольге (+375296471671).<br>7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.<br>8. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет |
| **Организатор аукциона** | ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97,<br>e-mail: info.torgi@orgtorg.by сайт https://orgtorg.by telegram: https://t.me/orgtorg |
| **Продавец** | ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1)<br>в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375296471671 (Ольга) |

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей права заключения договора аренды земельного участка

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12.

Лот № 1. Не завершенный строительством законсервированный жилой дом с инв. №230/U-16426, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (процент готовности 7 %: фундамент – бетонный, площадь застройки 119 кв. м) и право заключения договора аренды сроком на 50 лет земельного участка с кадастровым № 222750100001004809 площадью 0,1016 га для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, переулок Есенина, 40.

Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/право заключения договора аренды зем. участка): 4365,43 (3452,30/913,13) бел. руб. Задаток: 436,00 бел. руб. Удельный вес стоимости незавершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 79,08 %.

**Дата, время и место проведения аукциона: 23.11.2021 в 11.30** по адресу: 211174, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Ленинская, 6 в Лепельском районном исполнительном комитете». **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 25.10.2021 до 15.00 22.11.2021. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с:** BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300039625, получатель платежа: Лепельский райисполком. **Условия для победителя аукциона либо единственного участника:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; не позднее двух рабочих дней после совершения победителем аукциона вышеуказанных условий, заключить договор аренды земельного участка с Лепельским районным исполнительным комитетом; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок и уточнением его целевого назначения в Лепельский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); обратиться в Лепельский райисполком за выдачей разрешительной документации на строительство одноквартирного жилого дома; разработать проектно-сметную документацию на строительство одноквартирного жилого дома; завершить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные проектно-сметной документацией. **Назначение зем. участка** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – размещение объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются** граждане РБ, иностранные граждане, лица без гражданства (далее – граждане), индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, инд. предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; инд. предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации инд. предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или инд. предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; представителем или уполномоченным должностным лицом юр.лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. Документы, составленные за пределами РБ в соответствии с законодательством иностр. государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством. Консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/счет, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

---

В связи с ликвидацией филиала «Электромонтажное управление № 1» ОАО «Белэлектромонтаж» (протокол № 9/2021 заседания наблюдательного совета ОАО «Белэлектромонтаж» от 01.06.2021 г.) первичная профсоюзная организация филиала ЭМУ-1 ОАО «Белэлектромонтаж» прекращает деятельность.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220034, г. Минск, ул. Берестянская, 12.

УНП 101036687

---

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «ПМК-217»** (УНП 600031360) 222611, Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Гагарина, д. 5 в лице ликвидатора Климовича А.М., тел. +375 29 501 88 88.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **04 ноября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб., без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Производственная база, общ. пл. 5280,7 кв. м | 776 935,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 621/С-14125, общ. пл. 592,5 кв. м (здание административно-хозяйственное) | 99 500,00 |
| Местонахождение – Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Гагарина, д. 5 | | |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 25.10.2021 г. 09:00 по 03.11.2021 г. 17:00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звезда» от 21.09.2021г.

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ

• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

**Организатор аукциона**: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

**Продавец**: ЗАО «Горизонт-Белинвест-Девелопер», г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4, 220029

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by

| № лота | Наименование предмета аукциона | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
